Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 6 (6635) | 9 сакавіка 1940 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Сёння спаўняецца 50 год з дня нараджэння Вячэслава Міхайлавіча Молатава

Вернаму саратніку Леніна і Сталіна, главе Совецкага ўрада таварышу Молатаву—палкае прывітанне ад беларускага народа!



ВЕРНАМУ САРАТНІКУ ЛЕНІНА І СТАЛІНА— ВЯЧЭСЛАВУ МІХАЙЛАВІЧУ МОЛАТАВУ

Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі горача вітае цябе, вернага саратніка Леніна і Сталіна, кіраўніка совецкага ўрада — у дзень твайго пяцідзесяцігоддзя.

Усё сваё свядомае жыццё ты безупынна служыш справе рабочага класа, справе комунізма ў якасці выдатнага дзеяча і правадыра большэвіцкай партыі. У чорныя годы рэакцыі пасля паражэння рэволюцыі 1905—1907 гг., у годы ўздыму рабочага руху, у эпоху «Звезды» і «Правды», у агні першай сусветнай імперыялістычнай вайны — ты заўсёды высока трымаў сцяг большэвізма, нястомна змагаючыся за дыктатуру пролетарыята ў нашай краіне. Як член Петраградскага Ваенна-рэволюцыйнага камітэта, ты правёў вялікую рэволюцыйна-большэвіцкую работу ў кастрычніку 1917 года. Сваёй работай у якасці кіраўніка партыйных арганізацый Данбаса, Украіны, Масквы, у якасці сакратара ЦК ВКП(б), сваёй многагадовай слаўнай работай на пасту главы совецкага ўрада, ты заслужыў гарачую любоў і велізарную павагу партыі і працоўных Совецкага Саюза.

Як адзін з віднейшых правадыроў большэвіцкай партыі, як буйнейшы арганізатар социялістычнай эканомікі і новай, комуністычнай культуры, ты ўвасобіў у сабе лепшыя якасці палітычнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу. Ты заўсёды вёў і вядзеш паслядоўную барацьбу за ідэі марксізма-ленінізма, няўхільна адстойваючы лінію партыі супроць ворагаў партыі і совецкага народа, супроць трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў і іншых агентаў буржуазіі.

Тваёй энергіі, тваёй нястомнай рабоце на пасту Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР краіна социялізма ва многім абавязана сваімі поспехамі і перамогамі. У сваіх вусных і друкаваных выступленнях перад партыяй і краінай ты абагульваеш гіганцкі вопыт вялікай работы па стварэнню комуністычнага грамадства.

Жадаем табе, наш дарагі друг і таварыш, ад усёй душы многіх, многіх год здароўя і далейшай плодатворнай работы на карысць нашай партыі, на карысць нашай радзімы, на карысць комунізма.

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў).

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб узнагароджанні Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварыша ВЯЧЭСЛАВА МІХАЙЛАВІЧА МОЛАТАВА ордэнам Леніна

За выдатныя заслугі ў справе арганізацыі большэвіцкай партыі, стварэння і ўмацавання совецкай дзяржавы ўзнагародзіць Старшыню Совета Народных Камісараў СССР таварыша Вячэслава Міхайлавіча **Молатава**, у дзень яго пяцідзесяцігоддзя, — ордэнам **Леніна**.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
8 сакавіка 1940 г.

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі і Совет Народных Камісараў БССР шлюць Вам, вернаму сыну большэвіцкай партыі, главе Совецкага ўрада, бліжэйшаму саратніку вялікага Сталіна ў дзень Вашага слаўнага пяцідзесяцігоддзя палкае большэвіцкае прывітанне.

Усё Ваша жыццё і дзейнасць неразрыўна звязаны з дзейнасцю найвялікшых правадыроў пролетарыята Леніна і Сталіна.

У суровыя годы падполля, у барацьбе за перамогу Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, у грамадзянскай вайне, у барацьбе з ворагамі народа, з ворагамі социялізма, у барацьбе за пабудову і ўмацаванне социялістычнага грамадства, — Вы непахісна адстойвалі і беззаветна змагаліся за вялікую справу партыі Леніна—Сталіна.

З Вашым іменем звязаны найвялікшыя перамогі социялізма ў нашай краіне. Разам з вялікім Сталіным Вы арганізоўвалі і стварылі вялікае садружаства народаў—Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

Верны вучань Леніна і бліжэйшы саратнік правадыра народаў таварыша Сталіна, — Вы з'яўляецеся буйнейшым арганізатарам і кіраўніком большэвіцкай партыі і совецкай улады.

Мудрая знешняя палітыка Совецкага Ўрада, майстэрскі правадзімая Вамі, яшчэ вышэй узняла міжнародны аўтарытэт і значэнне Совецкага Саюза, расстроіла каварныя планы падпальшчыкаў вайны і забяспечыла мірную працу народаў СССР.

З іменем вялікага Сталіна, натхнёныя Вашым заклікам, часці нашай доблеснай Чырвонай Армії бліскуча выканалі свой інтэрнацыянальны абавязак і вызвалілі 13 мільёнаў прапоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Разам з таварышам Сталіным Вы штодзённа аказваеце беларускаму народу дапамогу ў будаўніцтве новага шчаслівага і радаснага жыцця. Беларусь, у мінулым адсталая, прыгнечаная калонія царызма, ператварылася ў квітнеючую, індустрыяльна-калгасную ордэнаносную социялістычную рэспубліку.

З'еднаны ў адзінай дзяржаве, беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ідзе ў першых радах да поўнай перамогі комунізма.

Жадаем Вам ад усёй душы, ад усяго сэрца многіх год жыцця і работы ва славу нашай вялікай радзімы, на карысць усіх працоўных, ва славу комунізма.

Няхай жыве Урад першай у свеце социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян і яго глава Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наш правадыр, наш бацька, друг і настаўнік таварыш Сталін!

СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ.

Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР таварышу Молатаву Вячэславу Міхайлавічу

АД ГАЛОЎНАГА ВАЕННАГА СОВЕТА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Галоўны Ваенны Совет ад імені Чырвонай Арміі ў дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя шле Вам, бліжэйшаму саратніку Леніна і Сталіна, сваё чырвонаармейскае прывітанне і гарачыя віншаванні.

Разам з Леніным і Сталіным Вы, таварыш Молатаў, будавалі магутную партыю большэвікоў, разам з імі Вы вялі партыю і рабочы клас па пабеданоснае ўзброенае паўстанне ў кастрычніку 1917 года і на заваяванне дыктатуры пролетарыята.

У годы грамадзянскай вайны, займаючыся палітычнай асветай Чырвонай Арміі, Вы кавалі перамогу на франтах грамадзянскай вайны.

З першых дзён стварэння Чырвонай Арміі Вы сталі любімым яе другам. Ваша нястомнае кіраўніцтва і сталінскія клопаты, як главы совецкай дзяржавы, аб Чырвонай Арміі забяспечылі яе моцнасць і сакрушальную магутнасць у баях з ворагамі нашай радзімы.

Ваша бязлітаснасць на ўсіх этапах да ворагаў нашай большэвіцкай партыі і социялістычнай радзімы служыць узорам для кожнага байца, камандзіра і палітработніка Чырвонай Арміі.

З Вашым іменем, як главы совецкай дзяржавы, звязаны вялікія гістарычныя перамогі ў нашай краіне і ўмацаванне магутнасці социялістычнай дзяржавы.

Па Вашаму загаду, як главы совецкай дзяржавы, 17 верасня 1939 года Чырвоная Армія з лозунгамі «За радзіму», «За вялікага Сталіна» разбіла хваслівую беларускую зграю і вызваліла трынаццаць мільёнаў адзінакроўных братоў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Зараз байцы Ленінградскай Ваеннай Акругі, абараняючы паўночна-заходнюю граніцу нашай радзімы і ліквідуючы агач імперыялістычнай вайны, па загаду Совецкага Ўрада громяць з той-жа сілай мапергеймаўскія войскі.

У дзень Вашага слаўнага пяцідзесяцігоддзя, таварыш Молатаў, жадаем Вам жыць доўгія і доўгія годы на карысць працоўных нашай радзімы.

ГАЛОЎНЫ ВАЕННЫ СОВЕТ.

Міжнародны комуністычны жаночы дзень

УРАЧЫСТЫЯ ПАСЯДЖЭННІ.

МАСКВА

Радасна і ўрачыста адзначалі грамадзянкі чырвонай сталіцы Міжнародны комуністычны жаночы дзень. У вялікім тэатры вечарам 8 сакавіка адбылося ўрачыстае пасяджэнне.

Гарачымі воплескамі аглашаецца зал. калі ў прэзідыуме паяўляюцца знатныя жанчыны совецкай краіны Героі Совецкага Саюза Грызадубава і Раскова, Хетагурава, Пічугіна, Троіцкая, Ангеліна, сакратар ВЦСПС К. І. Нікалаева, сакратар ЦК ВЛКСМ О. Мішакова, народная артыстка СССР Тарасава і іншыя. Горача вітаюць сабраўшыяся паяўленне ў прэзідыуме таварышаў Н. М. Шверніка, Г. М. Дзімітрава, А. С. Шчэрбакова, С. М. Будзённага і іншых.

Урачысты сход адкрывае сакратар МГК ВКП(б) тав. Папоў. Першыя словы ён прысвячае таварышу Сталіну.

Бурная авацыя ідзе ўжыцца некалькі мінут. Па залу пракатваюцца крыкі «ура», воклічы «Няхай жыве наш родны Сталін!» [illegible] ў пачотны прэзідыум урачыстага пасяджэння выбіраюцца таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Жданаў, Хрушчоў, Берыя, Швернік і Дзімітраў.

Слова для даклада аб Міжнародным комуністычным жаночым дні прадастаўляецца сакратару ВЦСПС тав. Нікалаевай. Пасля даклада Герой Совецкага Саюза Марына Раскова ўносіць прапанову пасла́ць прывітанне таварышу Сталіну і зачытала тэкст прывітальнага пісьма. Яе прапанова была прынята пад бурныя, працяглыя авацыі.

З велізарным уздымам, па прапанове народнай артыстцы СССР тав. А. К. Тарасавай, сабраўшыяся паслалі таксама прывітанне таварышу Молатаву, у якім горача віншуюць яго з 50-годзем з дня нараджэння. (ТАСС).

МІНСК

Учора вялікую залу Дзяржаўнага тэатра оперы і балета запоўнілі лепшыя людзі сталіцы БССР — прадстаўнікі партыйных, совецкіх, профсаюзных і комсамольскіх арганізацый.

Урачысты сход, прысвечаны 30-й гадавіне Міжнароднага комуністычнага жаночага дня адкрыў сакратар Мінскага абласнога камітэта КП(б)Б тав. Матвееў.

Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты ў пачотны прэзідыум аднадушна выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З дакладам аб 30-й гадавіне Міжнароднага комуністычнага жаночага дня выступіла тав. Уралава.

Затым слова атрымала старшыня калгаса імені Сталіна. Заблудаўскага раёна, Беластоцкай вобласці, тав. Е. Ф. Максімюк.

Дэлегацыя жанчын заходніх абласцей паднесла жанчынам сталіцы БССР у падарунак вытканыя кавёрчыкі з партрэтамі Леніна, Сталіна і Варашылава.

Сход, пад бурныя апладысменты прыняў тэкст прывітальных тэлеграм таварышам Сталіну і Молатаву, а таксама байцам, камандзірам і палітработнікам Ленінградскай Ваеннай Акругі і Чырвонасцяжнага Балтыйскага Флота.

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 8 сакавіка на фронце не адбылося нічога істотнага. У Выбаргскім заліве нашы часці занялі востраў Есі-Саары з мястэчкам Есісаары, востраў Кацілан-Саары з мястэчкам Рахкасаары востраў Терва-Саары, востраў Муста-Саары, востраў з мястэчкам Хіета-Саары.

Нашымі часцямі захвачана 12 гармат, 57 кулямётаў, 2 мільёны патронаў.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках праціўніка, пры гэтым збіты 2 самалёты праціўніка.

Да ведама дэлегатаў 3-й Мінскай абласной партканферэнцыі

3-я Мінская абласная партканферэнцыя адкрываецца 10 сакавіка, у 6 гадз. вечара, у Доме партактыва (рог вуліц Карла Маркса і Энгельса).

Выдача часовых пасведчанняў дэлегатам будзе праводзіцца ў памяшканні Мінскага абкома КП(б)Б (рог Ленінскай і Кірава, 2-гі паверх, пакой № 15).

9 сакавіка пасведчанні выдаюцца з 11 г. раніцы да 12 г. ночы і 10 сакавіка з 11 раніцы да 4 г. дня.

МІНСКІ АБКОМ КП(б)Б.

ПАВА ЎРАДА КРАІНЫ СОЦЫЯЛІЗМА

ння наша вялікая социялістычная ма адзначае 50-годзе з дня нара- ія главы Совецкага ўрада і Народна- амісара замежных спраў, члена Па- фо ЦК ВКП(б) Вячэслава Міхайлаві- олатава. Верны вучань Леніна, Вя- ў Міхайлавіч Молатаў з'яўляецца йшым саратнікам Сталіна і яго пер- памочнікам ва ўсім дзяржаўным бу- цтве Совецкага Саюза, ва ўсіх мера- мствах як унутранай, так і знеш- палітыкі. Тав. Молатаў з'яўляецца ейшым арганізатарам і кіраўніком пэвіцкай партыі і совецкай улады.

я наша неасяжная краіна, увесь наш мільённы совецкі народ ведае, як многа ў і робіць таварыш Молатаў на ка- ь нашай социялістычнай дзяржавы. іменем В. М. Молатава звязаны ўсе тныя падзеі ў жыцці СССР. Таварыш таў сумесна з вялікім правадыром даў таварышам Сталіным распрана- а і ажыццяўляе сталінскія пяцігодкі, інскую Канстытуцыю. Ён дапамагае народам нашай многанацыянальнай ы будаваць сваю культуру — со- ністычную па зместу і нацыянальную орме.

ічэ будучы 15-галовым юнаком. Вя- аў Міхайлавіч уступае ў РСДРП і, верны ленінец, цалкам аддае сябе на- ай справе. За рэволюцыйную дзей- ць таварыша Молатава не раз высы- ль, саджаюць у турмы. Аднак ні сткі, ні турмы не змаглі зламаць пал- рэволюцыянера. Пад кіраўніцтвам і казанняў Леніна і Сталіна таварыш таў актыўна працуе па згуртаванню ў партыі, вядзе вялікую прапагандыцкую і агітацыйную работу сярод ра- ых. Ён з'яўляецца дзейным работнікам большэвіцкіх газет «Звезда» і «Правда». ы-б партыя ні пасылала Вячэслава Міхайлавіча, усюды ён выконвае яе волю, яўляе ў рэволюцыйнай дзейнасці ць свой талант, усю сваю энергію.

Вялікую ролю адыгрывае Вячэслаў Мі- лавіч Молатаў у падрыхтоўцы Ка- ычніцкага паўстання.

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі тав. Молатаў адзін з віднейшых кіраўнікоў Совета- ых і салдацкіх дэпутатаў. Ён пра- старшынёй Совета народнай гаспадар- Паўночнай вобласці, старшынёй Ніжага- скага губернскага выканкома. У 20 годзе тав. Молатаў працуе сакра- ом Данецкага губкома партыі, а з некаторы час — сакратаром КП(б) Украіны. І ўсюды, дзе-б ны ні пасылаў Вячэслаў Міхайлавіч, ён ўхільна выконвае заданні партыі, астаючыся верным ленінцам-сталінцам, непахісным у барацьбе з ворагамі партыі і народа — трацкістамі, бухарынцамі, буржуазнымі нацыяналістамі і рознымі апартуністамі.

10 год таму назад партыя пасылае Вячэслава Міхайлавіча, як выпрабаванага і загартаванага ў баях большэвіка, на самы адказны ўчастак дзяржаўнай дзейнасці — на пост старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР. На гэтым высокім і адказным пасту тав. Молатаў паказвае сябе таленавітым арганізатарам, вялікім дзяржаўным дзеячом ленінска-сталінскага тыпу.

Наша краіна атрымала велізарнейшыя сусветна-гістарычныя перамогі ў будаўніцтве социялізма. У трэцяй пяцігодцы Совецкі Саюз уступіў у новую паласу развіцця — паласу завяршэння будаўніцтва бясклассавага социялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад социялізма да комунізма. У гэтай велізарнейшай рабоце вялікая роля належыць В. М. Молатаву. У дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР тав. Молатаў з прадзельнай яснасцю начартаў грандыёзныя перспектывы далейшага ўзыму народнай гаспадаркі нашай радзімы.

Усе грамадзяне нашай радзімы памятаюць мудрыя словы таварыша Молатава аб маральным і палітычным адзінстве совецкага народа, аб неразрыўнай сувязі большэвіцкай партыі са сваім народам.

Наш вялікі совецкі народ сваё маральна-палітычнае адзінства ўжо даказваў не раз, галасуючы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных у час выбараў у Советы дэпутатаў працоўных. Совецкі ўрад — самы моцны і самы ўстойлівы ўрад у свеце. Партыя, урад і народ у нас неадзялімы.

Увесь совецкі народ з глыбокай павагай і бязмежнай удзячнасцю адзначае выдатворную дзейнасць Вячэслава Міхайлавіча Молатава. У асобе тав. Молатава наш народ бачыць таленавітага дзяржаўнага дзеяча. Гэта так і ёсць. У разуладзе геніяльнай празарлівасці вялікага Сталіна і яго бліжэйшага саратніка В. М. Молатава расстроены каварныя планы англа-французскіх правакатараў вайны. Заключаныя паміж Совецкім Саюзам і Германіяй спачатку дагавор аб пенадлізе, а затым і дагавор аб дружбе і граніцы ўзаемных дзяржаўных інтарэсаў пашырылі моцны ўдар па падпальшчыках вайны.

Усім памятны верасноўскія дні 1939 года. Калі бяздарныя правіцелі панскай Польшчы кінулі прапоўнае насельніцтва на волю лёсу, глава совецкага ўрада В. М. Молатаў сказаў па радыё сваю гістарычную прамову. Наша доблесная Чырвоная Армія, выконваючы загад урада, з чэсцю выканала сваю вызваленчую місію, аказала дапамогу нашым адзінакроўным братам беларусам і украінцам, вызваліла іх з-пад панскага ярма.

Вялікія заслугі тав. Молатава ў справе ўмацавання абароназдольнасці нашай краіны. Тав. Молатаў падпісаў дагаворы аб узаемадапамозе з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, якія маюць выключнае абаронае, гаспадарчае і палітычнае значэнне.

Англа-французскія імперыялісты штурхнулі фінскую белагвардзейшчыну на авантуру супроць Совецкага Саюза. І тады на ўвесь свет прагучалі словы главы Ўрада Совецкага Саюза В. М. Молатава, заклікаючыя совецкі народ, яго Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот быць гатовымі да ўсякіх нечаканасцей. Прыгнечаны фінляндскі народ паднёсся супроць сваіх прыгнятальнікаў — манергеймаў і тапераў, і Народны камісар замежных спраў тав. Молатаў падпісвае дагавор аб узаемадапамозе і дружбе паміж Саюзам ССР і Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікай. Пайпер наша доблесная Чырвоная Армія дапамагае працоўным Фінляндыі ў іх барацьбе са зграяй наймітаў англа-французскага імперыялізма.

З вялікай любоўю адносіцца наш беларускі народ да главы Совецкага ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава. Тав. Молатаў многае зрабіў для нашай рэспублікі, дапамог ёй у развіцці гаспадаркі, навукі і культуры. Вячэслаў Міхайлавіч аддае ўсе свае сілы на ўмацаванне ленінска-сталінскай дружбы народаў. Свайму вызваленню з-пад гнёту панскай Польшчы і з'яднанню з Совецкім Саюзам народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі абавязаны совецкаму народу, большэвіцкай партыі, вялікаму Сталіну і кіраўніку Совецкага ўрада тав. Молатаву.

Сваю любоў і павагу да тав. Молатава наш народ выказаў аднадушным выбраннем яго ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і сталічнага горсовета. Такую ж любоў да главы Совецкага ўрада праяўляюць украінцы, грузіны, узбекі, казахі, армяне — усе народы нашай радзімы.

Беларускі народ, як і ўвесь 183-мільённы народ Совецкага Саюза, у дзень слаўнага 50-годдзя жадае Вам, Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў, доўгіх і доўгіх год жыцця і плодатворнай працы на карысць нашай вялікай социялістычнай радзімы.

Пяцідзесяцігоддзе В. М. Молатава

Вячэслаў Міхайлавіч МОЛАТАЎ

КАРОТКАЯ БІЯГРАФІЯ

Молатаў (Скрабін) Вячэслаў Міхайлавіч нарадзіўся 9 сакавіка 1890 г. у слабадзе Кукарцы, Вяцкай губерні (цяпер г. Совецк, Кіраўскай абласці), у сям'і служачага.

У 1902 г. Молатаў паступае ў 1-е казанскае рэальнае вучылішча. Ужо ў 1905 г. ён далучаецца да рэвалюцыйнага руху, удзельнічаючы ў гуртках, мітынгах і дэманстрацыях супроць царызма. У 1906 г. Молатаў уступае ў сацыял-дэмакратычную (большэвіцкую) арганізацыю ў г. Казані. Ён становіцца адным з галоўных арганізатараў рэвалюцыйна настроенай часткі вучнёўскай моладзі. Рэвалюцыйная арганізацыя вучняў стварае свой агульнагарадскі кіруючы цэнтр, у які ўваходзіць Молатаў.

«1908—1912 годы былі найцяжэйшым перыядам для рэвалюцыйнай работы. Пасля паражэння рэвалюцыі, ва ўмовах заняпалу рэвалюцыйнага руху і стомленасці мас большэвікі змянілі сваю тактыку і перайшлі ад прамой барацьбы супроць царызма да абходных шляхоў гэтай барацьбы». (Гісторыя Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў). Кароткі курс, стар. 138). У цяжкіх умовах рэакцыі т. Молатаў скарыстоўвае малейшыя легальныя магчымасці для збірання рэвалюцыйных сіл, для падрыхтоўкі новага наступлення супроць царскага самадзяржаўя.

Рэвалюцыйная арганізацыя вучняў, адным з кіраўнікоў якой быў т. Молатаў, стварае нелегальныя марксісцкія гурткі ў навучальных установах Казані, кіруе апазіцыйнымі выступленнямі вучняў супроць казарменнага школьнага рэжыма, арганізуе грашовыя зборы і матэрыяльную дапамогу зняволеным у турмах і ссыльным рэвалюцыянерам, дапамагае распаўсюджванню большэвіцкай літаратуры, вядзе прапагандысцкую работу сярод рабочых.

У красавіку 1909 г. Молатаў разам з радам іншых членаў рэвалюцыйнай арганізацыі вучняў арыштоўваецца і ў чэрвені таго-ж года высылаецца на два гады ў Валагодскую губерню: спачатку ў Тоцьму і Сольвычэгодск, а затым у Вологду, дзе ён экстэрнам здае выпускныя экзамены ў рэальным вучылішчы.

У Вологдзе, знаходзячыся пад наглядам паліцыі, Молатаў вядзе актыўную нелегальную партыйную работу сярод чыгуначных рабочых, складаўшых у горадзе галоўныя пролетарскія кадры. Тав. Молатаў выступае супроць меншавікоў, якія патрабавалі знішчэння нелегальнай рэвалюцыйнай партыі, ліквідацыі якой-бы то ні было нелегальнай барацьбы. Большэвікі пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна павялі бязлітасную барацьбу з лакеямі буржуазіі, якіх падтрымліваў іуда Троцкі. Большэвіцкая арганізацыя г. Вологды, створаная Молатавым, у 1910—1911 гг. узмацняе сваю дзейнасць і цвёрда праводзіць ленінскую лінію.

Вялікую ўвагу ў гэтыя годы Молатаў удзяляе вывучэнню прац класікаў марксізма. Валагодскае і вяцкае жандарскія ўпраўленні ў сваіх агентурных зводках адзначаюць, што Молатаў «адрозніваецца веданнем с.-д. праграмы і літаратуры», «з'яўляецца сур'ёзным арганізатарам».

Пасля сканчэння тэрміну ссылкі, у чэрвені 1911 г., Молатаў едзе ў Пецербург і паступае ў Пецербургскі політэхнічны інстытут. Тут ён праводзіць вялікую работу па згуртаванню большэвіцкіх груп сярод студэнцтва. Пры яго актыўным удзеле былі створаны большэвіцкія групы і ў іншых вышэйшых навучальных установах Пецербурга, аб'еднаныя ў агульнагарадскім камітэце большэвіцкіх студэнцкіх арганізацый. Студэнцкія большэвіцкія арганізацыі Пецербурга ствараюць рад нелегальных гурткоў, кіруюць рэвалюцыйнымі выступленнямі студэнцтва супроць царызма, распаўсюджваюць большэвіцкія пракламацыі і т. д. Большэвіцкія студэнцкія арганізацыі даюць партыі кадры адукаваных прапагандыстаў. Молатаў вядзе работу ў некалькіх рабочых гуртках.

З пачатку 1912 г. таварыш Молатаў працуе ў большэвіцкай газеце «Звезда», а затым прымае самы блізкі ўдзел у стварэнні большэвіцкай штодзённай газеты «Правда», якая з'явілася магутнай зброяй у руках большэвіцкай партыі ў справе ўмацавання сваіх арганізацый і заваявання ўплыву ў масах. Молатаў уваходзіць у састаў рэдакцыі «Правды» і актыўна супрацоўнічае ў ёй, друкуючы свае артыкулы без подпісу або пад рознымі псеўдонімамі: А. Рабін, В. Міхайлаў, А. Званаў. З гэтага часу Молатаў пачынае сустракацца з таварышам Сталіным у «Правде». Будучы сакратаром рэдакцыі ў 1912 г. і з'яўляючыся адным з кіраўнікоў «Правды», Молатаў вядзе перапіску з загранічным цэнтрам большэвікоў і асабіста з В. І. Леніным. Не глядзячы на праследаванні паліцыі, вымусіўшай яго перайсці ў канцы 1912 г. на нелегальнае становішча, Молатаў вядзе вялікую работу. Ён — член Пецербургскага камітэта большэвікоў, вядзе прапагандысцкую работу ў Выбаргскім раёне і сярод чыгуначнікаў Нікалаеўскай (цяпер Акцябрскай) чыгункі, а таксама прымае кіруючы ўдзел у выбарчай кампаніі ў IV Дзяржаўную думу, выкрываючы здраднічую пазіцыю староннікаў пагаднення з ліберальнай буржуазіяй — меншавікоў. Молатаў прымае ўдзел і ў кіраўніцтве большэвіцкай думскай фракцыяй.

У красавіку 1913 г. пры ліквідацыі царскай ахранкай «аб'еднанага сацыял-дэмакратычнага студэнцкага камітэта» Молатава арыштоўваюць і праз некалькі месяцаў высылаюць з Пецербурга з забаронай пражываць у радзе буйных гарадоў і прамысловых губерань (так званыя «64 пункты»).

Пасля выхаду з турмы Молатаў, пасяліўшыся недалёка ад Пецербурга, прадаўжае нелегальную партыйную работу ў Пецербургскай арганізацыі большэвікоў і ў «Правде».

У гэтым жа перыяд Молатаў актыўна ўдзельнічае ў рабоце пецербургскіх профсаюзаў, выступае на профсаюзных сходах рабочых, асвятляе іх дзейнасць у «Правде», дапамагае большэвіцкім дзеячам у профсаюзах, а таксама ў выданні профсаюзных журналаў. З няўтомнай энергіяй змагаецца Молатаў за ажыццяўленне ленінска-сталінскай дырэктывы аб заваяванні на бок большэвікоў большасці прафесіянальных саюзаў. Як вядома, злучаючы нелегальную работу з легальнай, большэвікі здолелі выканаць гэту задачу і атрымалі рад бліскучых перамог пры выбарах у кіруючыя профсаюзныя органы.

У канцы 1913 г. Молатава зноў арыштоўваюць за ўдзел у рабоце Пецербургскага камітэта РСДРП(б), але за недастатковасцю ўлік вызваляюць пад нагляд паліцыі. З прычыны забароны жыць у самым Пецербургу Молатаў зноў пасяляецца пад Пецербургам і прадаўжае рэвалюцыйную дзейнасць сярод рабочых, супрацоўнічаючы ў «Правде» і ў другім большэвіцкім органе—журнале «Просвещение».

У маі 1914 г. Молатава зноў арыштоўваюць і неўзабаве высылаюць з забаронай пражываць у сталіцы і ў многіх іншых гарадах і губернях (так званыя «45 пунктаў»).

У пачатку імперыялістычнай вайны Молатаў знаходзіцца ў Пецербургу. Ён займае паслядоўную ленінскую пазіцыю ў пытанні аб вайне. Ён выкрывае захватніцкі, імперыялістычны характар гэтай вайны, вядзе непрымірымую барацьбу з шавіністычнымі настроямі ў радах рабочых арганізацый.

Неўзабаве Молатаў пераязджае ў Маскву, дзе разгортвае работу па аднаўленню маскоўскай большэвіцкай арганізацыі, разгромленай царскай ахранкай у пачатку вайны. Ён крапатліва збірае разрозненыя сілы маскоўскіх большэвікоў і арганізуе ачыстку партыйных радоў ад шматлікіх правакатараў — ахраннікаў. Яму ўдаецца арганізаваць некалькі актыўных большэвіцкіх груп у розных раёнах Масквы. Асноўную работу Молатаў праводзіць сярод рабочых Лефартоўскага, Сіманаўскага і Прасненскага раёнаў, кіруючы стварэннем партыйных арганізацый на маскоўскіх заводах і фабрыках, выпускам і распаўсюджаннем большэвіцкай літаратуры супроць царызма і імперыялістычнай вайны.

Вясной 1915 г. было падрыхтавана склікание маскоўскай агульнагарадской канферэнцыі большэвікоў, але па даносу прабраўшыхся ў арганізацыю правакатараў, Молатаў у чэрвені арыштоўваецца і ў верасні таго-ж года высылаецца этапным парадкам на тры годы ў Іркуцкую губерню (сяло Манзурка).

У маі 1916 г. Молатаў уцякае з Сібірскай ссылкі, едзе ў Петраград, дзе вядзе нелегальную работу. Восенню 1916 г. Молатаў па ўказанню Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі, які знаходзіўся за граніцай, каптыруецца ў састаў Расійскага бюро ЦК большэвікоў і ўзначальвае гэтае бюро. Бюро ЦК на чале с тав. Молатавым у гэты перыяд ажыццяўляе кіраўніцтва практычнай работай большэвіцкай партыі. Рад баявых пракламацый, выданых бюро ЦК і Пецербургскім камітэтам большэвікоў, прысвечаных вайне і надзённым задачам рабочага руху, выдаецца пры бліжэйшым удзеле Молатава. У гэты перыяд Молатаў супрацоўнічае таксама ў адзіным легальным большэвіцкім журнале «Вопросы страхования». Выхад гэтага журнала ў свет быў адзначан таварышам Сталіным, як вялікая падзея. Вітаючы выданне журнала, таварыш Сталін пісаў з далёкай ссылкі, што задачай новага большэвіцкага органа з'яўляецца прыкласці «ўсе намаганні і стараннi і да справы ідэйнага страхавання рабочага класа нашай краіны ад глыбока разбэшчваючай, антыпролетарскай і ў корані супярэчнай прынцыпам міжнароднасці пропаведзі пп. патрэсавых, лявіцкіх і плеханавых».

Молатаў непасрэдна ўдзельнічае ў большэвіцкім кіраўніцтве рэвалюцыйным рухам, падрыхтаваўшым лютаўскую рэвалюцыю 1917 года. У час лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і затым на працягу ўсёй далейшай работы ў Петраградзе Молатаў—член Петраградскага камітэта РСДРП(б). Як прадстаўнік большэвіцкай партыі, ён уваходзіць у выканаўчы камітэт Петраградскага совета рабочых дэпутатаў з дня яго ўтварэння, прымае бліжэйшы ўдзел у стварэнні салдацкай секцыі і ў ператварэнні Петраградскага совета ў совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, удзельнічае ў рабоце большэвіцкай фракцыі совета.

Молатаў кіруе аднаўленнем і выпускам «Правды» і да звароту Сталіна са ссылкі з'яўляецца адным з галоўных рэдактароў «Правды». Молатаў прымае таксама актыўны ўдзел у работах красавіцкай партыйнай канферэнцыі, VI з'езда, з'яўляючыся адным з кіраўнікоў петраградскай большэвіцкай арганізацыі.

У сваёй прамове на VI з'ездзе партыі Молатаў ўслед за Леніным і Сталіным указвае, што «ўладу можна атрымаць толькі сілаю». «Толькі пролетарыят і бяднейшае сялянства хочуць узяць улаву ў свае рукі, змогуць гэта зрабіць і зробяць у інтарэсах большасці, пралетаўнікамі якой яны з'яўляюцца». Нам, гаварыў таварыш Молатаў, «на справе трэба ўказаць алзіны выхад з стварыўшагася становішча — дыктатуру пролетарыята і бяднейшага сялянства».

У час падрыхтоўкі і ў дні Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Молатаў—адзін з кіраўнікоў большэвікоў, працуючых у Петраградзе непасрэдна пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна. У якасці прадстаўніка Петраградскага камітэта большэвікоў ён уваходзіць у састаў Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, кіраваўшага паўстаннем у кастрычніцкія дні. Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Молатаў з'яўляецца адным з кіраўнікоў Петраградскага совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

У пачатку 1918 г. партыя вылучае Молатава Старшынёй Совета Народнай Гаспадаркі Паўночнай абласці, у якую ўваходзіла тады 7 паўночных губерань, у тым ліку Петраградская. Пад яго кіраўніцтвам у Петраградзе і ва ўсёй Паўночнай абласці праводзіцца нацыяналізацыя фабрык і заводаў, арганізуецца рабочы кантроль над вытворчасцю. У працэсе гэтай работы рабочыя петраградскіх заводаў асвайваюць складаную тэхніку кіравання вытворчасцю і ўпершыню вылучаюць са свайго асяроддзя кіруючыя кадры будаўнікоў сацыялістычнай гаспадаркі. Першаму практычнаму вопыту будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі паг водзіцца вынік у брашуры «Як рабочыя будуюць сацыялістычную гаспадарку», вышаўшай у канцы 1918 года.

Летам 1919 года Молатаў назначаецца ўпаўнаважаным партыі і совецкага ўрада ў Паволожжа. Яму даручаецца ў найкарацейшы тэрмін стварыць і ўмацаваць совецкія і партыйныя арганізацыі ў вызваленых Чырвонай Арміяй ад чэхаславацкіх і калчакоўскіх войск раёнах. Молатаў разам з кіруючымі работнікамі розных наркаматаў аб'язджае на працягу некалькіх месяцаў паволжскія і прыкамскія гарады (Н.-Ноўгарад, Чэбаксары, Казань, Чыстопаль, Іжэўск, Перм, Сімбірск, Самара, Саратаў і інш.), а таксама многія сёлы і вёскі на Волзе і Каме. Пад кіраўніцтвам тав. Молатава ў Паволожжы ўмацоўваецца партыйны і совецкі апарат.

З канца 1919 г. Молатаў — старшыня Ніжагародскага губернскага выканкома, а ў верасні 1920 г. ён накіроўваецца Цэнтральным Камітэтам партыі ў Данбас, дзе выбіраецца сакратаром Данецкага губкома. На IX усерасійскім з'ездзе РКП(б) Молатаў выбіраецца кандыдатам у члены ЦК РКП(б). У лістападзе 1920 года ён выбіраецца членам і сакратаром ЦК КП(б) Украіны. У 1920—21 гг. Молатаў рашуча праводзіць ленінскую лінію ў профсаюзнай дыскусіі супроць усіх апазіцыйных плыняў — супроць трацкістаў і бухарынцаў, супроць «рабочай апазіцыі» і дэцыстаў (група так званага «дэмакратычнага цэнтралізма»).

На X з'ездзе партыі ў сакавіку 1921 г., калі партыя пад кіраўніцтвам Леніна перайшла да новай эканамічнай палітыкі, Молатаў выбіраецца сакратаром ЦК РКП(б), а таксама кандыдатам у члены Палітбюро ЦК. Уся работа Молатава ў ЦК РКП(б) працякае ў штодзённай непасрэднай сувязі з Леніным і Сталіным, пад іх кіраўніцтвам.

З гэтага часу В. М. Молатаў працуе ў Маскве, ён удзельнічае ва ўсёй кіруючай рабоце партыі і совецкай дзяржавы, няўхільна адстайваючы ленінскую лінію ў барацьбе партыі з трацкізмам і іншымі дробнабуржуазнымі групамі і плынямі.

Са стулзеня 1926 г., пасля XIV з'езда партыі, Молатаў выбіраецца членам Прэзідыума Усерасійскага ЦВК, а ў 1929 г.—членам прэзідыума ЦВК СССР.

Молатаву належыць выключная роля ў барацьбе за генеральную лінію партыі, за індустрыялізацыю нашай краіны. Выкрываючы падкопы трацкісцка-зіноўеўскага антыпартыйнага блока, Молатаў указваў, што самай характэрнай рысай апазіцыі з'яўляецца яе нявер'е ў магчымасць будаўніцтва сацыялізма ў нашай краіне. Ён бязлітасна ўскрываў спробы трацкісцка-зіноўеўскіх агентаў імперыялізма сарваць будаўніцтва сацыялістычнага грамадства, навязаць партыі план эканамічнага закабалення СССР імперыялістычнымі дзяржавамі.

Развіваючы мысль таварыша Сталіна, Молатаў ставіць перад сацыялістычнай прамысловасцю задачу «зрабіцца актыўным і сапраўды магутным рухавіком развіцця сельскай гаспадаркі, ствараючы ўсё большыя ўмовы для пераўтварэння апошняй на аснове вышэйшай тэхнікі, калектыўнай працы і буйнай вытворчасці».

Уся наша знешняя і ўнутраная абстаноўка, гаварыў т. Молатаў, патрабуе паслядоўнага правядзення паскоранага тэмпа індустрыялізацыі краіны. Іменна гэта, падкрэслівае т. Молатаў, ёсць важнейшая ўмова пачаўшайся рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна, таварыш Молатаў з выключнай энергіяй і прынцыповасцю змагаецца за ажыццяўленне ленінска-сталінскага плана далучэння совецкага сялянства да будаўніцтва сацыялізма. У сваім выступленні на маскоўскім партактыве 30 лістапада 1928 г. т. Молатаў указвае, што толькі на аснове сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, на аснове стварэння калгасаў можна «забяспечыць карэнны пералом у росце прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі, у паляпшэнні становішча працоўных мас вёскі і ў стварэнні сапраўды трывалай харчавой і сыравінай базы для развіцця сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны».

Перамога сацыялізма ў СССР з'яўляецца лепшым пацвярджэннем правільнасці гэтых палажэнняў т. Молатава, выпрацаўных са сталінскіх указанняў. Заслугі т. Молатава ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі вядомы ўсёй краіне.

У перыяд разгараўшайся ў сярэдзіне 1928 г. барацьбы партыі супроць правых, сакратаром МК ВКП(б) па сумяшчэнню з работай сакратара ЦК ВКП(б) выбіраецца тав. Молатаў. Адстайваючы генеральную лінію партыі, т. Молатаў наносіць сакрушаючыя ўдары трацкісцка-бухарынскім выраткам. Ён выступае таксама рашуча супроць гнілога лібералізма і прымірэнцтва. «Ленінізм, які з'яўляецца ідэйнай асновай нашай партыі, азначае непрымірымую барацьбу з усякімі ўхіламі ад генеральнай лініі партыі і разам з тым непрымірымую барацьбу супроць абывацельска-бескрынцытнай цярпімасці (прымірэнцтва) да гэтых ухілаў». (В. М. Молатаў. Даклад на маскоўскім партактыве 30 лістапада 1928 г.).

З 19 снежня 1930 г. В. М. Молатаў—на пасту Старшыні Соўнаркома СССР.

Выступаючы на снежаньскім аб'еднаным пленуме ЦК і ЦКК у 1930 г., В. М. Молатаў, у сувязі з назначэннем яго Старшынёй Соўнаркома СССР, сказаў:

«Зараз, у сувязі з маім новым назначэннем, я не магу не сказаць некалькі слоў і аб сабе, аб сваёй рабоце.

Я рос у большэвіцкай партыі і звязан з ёю многімі годамі яснпннай работы. У мяне, як у комуніста, няма і не можа быць большага жадання, чым быць на справе вучнем Леніна. Мне надоўга прыйшлося працаваць пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна, але для мяне, як комуніста, заўсёды было і астаецца галоўнай задачай усваенне вучэння Маркса—Леніна і актыўны ўдзел у справе правядзення ў жыццё марксісцка-ленінскага вучэння. На працягу апошніх год мне прышлося, у якасці сакратара Цэнтральнага Камітэта, працаваць школу большэвіцкай работы пад непасрэдным кіраўніцтвам лепшага вучня Леніна, пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Сталіна. Я гарджуся гэтым.

Дагэтуль мне прыходзілася працаваць галоўным чынам, у якасці партыйнага работніка. Заяўляю вам, таварышы, і на работу ў Соўнарком я іду ў якасці партыйнага работніка, у якасці правадніка волі партыі і яе Цэнтральнага Камітэта».

В. М. Молатаў няспынна заклікае партыю да павышэння большэвіцкай зоркасці і пільнасці. Ён няспынна напамінае совецкаму народу аб тым, што, знаходзячыся ў капіталістычным акружэнні, «аддавацца бяспечнасці — значыць забываць аб сваім пярэйшым абавязку перад народам, перад працоўнымі». Трэба, указвае т. Молатаў, мацаваць абарону Совецкага Саюза, каб заўсёды быць гатовым адказаць сакрушаючым ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны.

Сталінская індустрыялізацыя нашай краіны, правадзімая пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Молатава, забяспечыла выдатнае тэхнічнае аснашчэнне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Молатаў удзяляе выключную ўвагу кадрам Чырвонай Арміі і флота. На II сесіі ЦВК Саюза ССР, засядаўшай у стулзені 1936 года, тав. Молатаў паставіў задачу, «каб уся наша армія складалася з адданых і ведаючых да канца сваю справу байцоў-лётчыкаў, артылерыстаў, хімікаў, танкістаў, стралкоў і байцоў усіх іншых абходных відаў зброі», і падкрэсліў неабходнасць «яшчэ больш умацаваць і п[illegible] няць значэнне кіруючых кадраў нашай арміі».

У 1939 годзе Молатаў назначаецца [illegible] сумяшчэнню Народным Камісарам Замежных Спраў СССР.

Ва ўмовах выключна складанай міжнароднай абстаноўкі, ва ўмовах, калі [illegible] гая імперыялістычная вайна перарас[illegible] ў сусветную бойню, Молатаў ажыцця[illegible] ляе сталінскую палітыку міру і на асн[illegible] рэалізацыі ўказанняў таварыша Сталі[illegible] дабіваецца буйнейшых поспехаў па лі[illegible] ўмацавання міжнароднага аўтарыт[illegible] СССР. Гандлёва-крэдытнае пагадненне [illegible] між Германіяй і СССР, дагавор аб не[illegible] пазе, дагавор аб дружбе і граніцы м[illegible] СССР і Германіяй, гаспадарчае пагадн[illegible] не з Германіяй — усе гэтыя знеш[illegible] палітычныя акты, стварыўшыя прыязн[illegible] адносіны паміж СССР і Германіяй, р[illegible] веялі ў прах спробы англа-французс[illegible] імперыялістаў учапіць Совецкі Саюз [illegible] вайну дзеля іх інтарэсаў. Заключаны [illegible] гаворы аб узаемадапамозе з Латві[illegible] Эстоніяй і Літвой. На аснове пакта [illegible] узаемадапамозе з Народным Урадам дэ[illegible] кратычнай Фінляндыі ліквідуецца н[illegible] больш небяспечны ачаг вайны, створа[illegible] фінскай белагвардзейшчынай на подс[illegible] пах да Ленінграда. За кароткі час сва[illegible] прабывання на пасту Народнага Камісар[illegible] Замежных Спраў тав. Молатаў здо[illegible] вырашыць цэлы рад пытанняў знешн[illegible] палітыкі СССР, маючых гістарычн[illegible] значэнне.

Выступленні, даклады і артыкулы [illegible] латава ўзбагачаюць тэорыю марксізм-ленінізма; сваім астрыём яны накіраваны супроць усіх і ўсякіх антыленінскіх п[illegible] няў і ўхілаў.

На працягу 1921—1930 гг. Молат[illegible] у якасці сакратара ЦК ВКП(б) вед[illegible] пытаннямі партыйнага будаўніцтва і п[illegible] бору партыйных кадраў. На гэтыя тэ[illegible] апублікаваны наступныя яго работ[illegible] «Пытанні партыйнай практыкі» (брош[illegible] ра), «Партыя і ленінскі заклік» (бр[illegible] шура), даклады на XI, XIII і XIV п[illegible] тыйных з'ездах па арганізацыйных п[illegible] таннях і інш.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзен[illegible] калектывізацыі Молатаў выступаў з [illegible] руючымі дакладамі на партыйных з'[illegible] дах, канферэнцыях і на пленумах [illegible] ВКП(б) па пытаннях, звязаных з работ[illegible] партыі ў вёсцы. На гэтую тэму апуб[illegible] каван рад яго артыкулаў у нашым бо[illegible] шэвіцкім друку. З прац В. М. Молата[illegible] па гэтых пытаннях трэба ўказаць пе[illegible] за ўсё наступнае: зборнік артыкул[illegible] і прамоў «Палітыка партыі ў вёсцы [illegible] даклад на XV партыйным з'ездзе «[illegible] рабоце ў вёсцы».

Пытанні сацыялістычнай індустрыялі[illegible] цыі краіны, першая, другая, трэцяя п[illegible] цігодкі, совецкае будаўніцтва і совецк[illegible] Канстытуцыя, нацыянальнае пытанне [illegible] дружба народаў СССР і, нарэшце, пыта[illegible] ні міжнароднай палітыкі — усё гэ[illegible] тэмы, якім надаецца вялікая ўвага [illegible] артыкулах і выступленнях Молатава. [illegible] ліку выданых твораў тав. Молатав[illegible] «У барацьбе за сацыялізм» — збор[illegible] артыкулаў і дакладаў, «Вялікая друж[illegible] народаў СССР» — зборнік прамоў, «А[illegible] тыкулы і прамовы» (1935—1936 гг.[illegible] «Да дваццаціголдзя Кастрычніцкай рэ[illegible] люцыі», «21-я гадавіна Кастрычніцк[illegible] рэвалюцыі», «22-я гадавіна Кастрычні[illegible] кай рэвалюцыі», «Аб вышэйшай школе» [illegible] рад выступленняў па пытаннях унутрана[illegible] і знешняй палітыкі СССР.

Увесь совецкі народ з глыбокай пав[illegible] гай і бязмежнай удзячнасцю адзнача[illegible] плённую дзейнасць Вячэслава Міхайлав[illegible] ча. Сваю любоў да таварыша Молата[illegible] народы СССР выразілі аднадушны[illegible] яго выбраннем у дэпутаты Вярхоўнаг[illegible] Совета СССР, Вярхоўных Советаў саю[illegible] ных і аўтаномных рэспублік. Прапоўны[illegible] Совецкага Саюза шлюць Вячэславу М[illegible] хайлавічу — непахіснаму ленінцу-сталі[illegible] цу—гарачае прывітанне і віншаванні [illegible] сувязі з споўніўшымся пяцідзесяцігоддзе[illegible]

Пяхай жыве яшчэ доўгія гады Вяч[illegible] слаў Міхайлавіч Молатаў — бліжэйш[illegible] саратнік і друг вялікага Сталіна!

І. В. Сталін і В. М. Молатаў на адкрыцці метро (здымак 1935 г.). Фото І. Шагін.

Тт. В. М. Молатаў і К. Е. Варашылаў у прэзідыуме нарады кіруючых работнікаў МТС вясельных органаў з кіраўнікамі партыі і ўрада ў 1936 годзе. (Фота-кліше ТАСС).

В. І. Ленін, І. В. Сталін і В. М. Молатаў у рэдакцыі газеты «Правда» ў 1917 годзе. Рысунак П. Васільева.

Пяцідзесяцігоддзе В. М. Молатава

ГЛАВА СОВЕЦКАГА ЎРАДА

А. ВЫШЫНСКІ

Уся наша краіна ўрачыста адзначае пяцідзесяцігоддзе з дня нараджэння главы совецкага ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава, выдатнага чалавека і палітычнага дзеяча бліскучай эпохі перамогшага марксізма, вернага вучня Леніна, бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна.

В. М. Молатаў—адзін з самых яркіх дзеячаў такога тыпу палітычных дзеячаў, аб якіх гаварыў таварыш Сталін у сваёй прамове на выбарчым сходзе 11 лютага 1937 года. Звяртаючыся да выбаршчыкаў, таварыш Сталін сказаў, што ён павінен патрабаваць ад сваіх депутатаў, каб яны былі палітычнымі дзеячамі ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі і ў баі і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін; каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа прымае ўскладненцца і на гарызонце выгляадаецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін; каб яны былі гэтак-жа мудры і настойлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін; каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін; каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Менна такім палітычным дзеячом ленінскага тыпу і з'яўляецца Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў. З іменем таварыша Молатава звязаны выключныя па сваёму значэнню падзеі, увайшоўшыя ў гісторыю сусветнага пролетарскага руху, у гісторыю барацьбы рабочых і сялян нашай краіны за пабудову першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы.

В. М. Молатаў — адзін з арганізатараў Кампартыі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, адзін з арганізатараў совецкай улады, выдатны кіраўнік совецкага ўрада, які нязменна, на працягу ўсяго пялога дзесяцігоддзя займае пост старшыні Совета Народных Камісараў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Таварыш Молатаў быў заклікан на гэты пост у 1930 годзе. Гэты год увайшоў у гісторыю соцыялістычнага будаўніцтва СССР, як адзін з самых выдатных годаў першага дзесяцігоддзя. То быў трансфармацыйны год першай сталінскай пяцігодкі.

1930—1940 годы—гэта дзесяцігоддзе, гэты год якога каштуе дзесяткаў год другой эпохі сусветнай гісторыі. Гэта дзесяцігоддзе азнаменавана перамогай соцыялізма ў СССР, стварэннем сусветнагістарычнага акта—Вялікай Сталінскай Канстытуцыі, — выключным росквітам творчых сіл народаў Совецкага Саюза, згуртаваных вакол партыі Леніна—Сталіна і вядучых свету нябачанае да таго і недасягнутае ні ў якой іншай краіне маральнае і палітычнае адзінства.

Мудрае сталінскае кіраўніцтва забяспечыла поўны поспех рашучага наступлення на капіталістычныя элементы па ўсяму народнагаспадарчаму фронту, наступлення, пачатага ў год «вялікага пералому», як сказаў таварыш Сталін 1929 год. Значэнне гэтай перамогі было велізарным. Ацэньваючы яе рэзультаты, В. М. Молатаў параўноўвае 1929 год з 1918 годам: у 1918 годзе «соцыялістычная рэволюцыя па-сапраўднаму шагнула з горада ў вёску», у 1929 годзе асноўная сялянская маса—сераднякі — канчаткова павернула к соцыялізму.

Заваяванне пролетарыятам на свой бок сялянскіх мас вырашыла поспех соцыялістычнай рэволюцыі.

Так было ў 1918 годзе, так адбылося і 1929 годзе.

«Гэтыя два этапы,—гаварыў у 1931 годзе таварыш Молатаў,—маюць рашаючае значэнне для справы соцыялізма ў нашай краіне. Гэтыя дзве даты—1918 і 1929 гады—вехі перамог соцыялізма на самым трудным і цяжкім гаспадарчым фронце—на фронце соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі» (В. Молатаў. «У барацьбе за соцыялізм», стар. 218).

Канчатковы паварот асноўных сялянскіх мас к соцыялізму азначаў поўны провал усіх надзей буржуазнай контрэвалюцыі на аднаўленне капіталізма ў СССР. Вядома, што гэтыя надзеі буржуазіі былі вызначаны не платанічнымі. Капіталісты, у першую чаргу англа-французскія буржуа, арганізатары антысовецкіх наскокаў і правакацый, міжнародныя грабіцелі і афесіянальныя падпальшчыкі вайны, сістэматычна на ўсім працягу мінулых год не адкрыта, то тайна практыкаваліся ў арганізацыі ўсялякіх змоў супроць совецкай дзяржавы, скарыстоўваючы для гэтага розныя антысовецкія групы і групкі ўнутры СССР і за яго межамі.

Трацкісты і правыя, меншавікі і эсэры, чэны так званай «Прампартыі», кулацкая група Чаянава — Кандрацьева, шпіёны, дывэрсанты і гэрарысты з года ў год дзелі па палбухторванню найбольш агалцелай часткі міжнароднай буржуазіі барацьбу супроць Совецкага Саюза, супроць совецкай улады.

Гэта гнюсная работа міжнародных злодзеяў і іх праваграцкіцкай агентуры была выкрыта нашай партыяй. Змоўшчыкі і здрадзіцелі былі разгромлены. Разгром ворагаў соцыялізма абазначыў далейшую барацьбу за арганізацыю новага грамадскага ладу ў СССР.

У гэтай гіганцкай рабоце па разгрому ворагаў і ўмацаванню магутнасці совецкай дзяржавы вялікае месца належыць В. М. Молатаву, як главе і кіраўніку совецкага ўрада, як выдатнаму палітычнаму і грамадскаму дзеячу ленінска-сталінскага тыпу, як выдатнаму тэарэтыку нашай партыі, члену Палітбюро ЦК ВКП(б), бліжэйшаму саратніку вялікага Сталіна.

***

Годы першай пяцігодкі, заклаўшы асновы магутнага развіцця соцыялістычнай прамысловасці, і ў першую чаргу цяжкай індустрыі СССР, былі гадамі, калі з асаблівай сілай разгарнуліся спробы кулацка-капіталістычных элементаў у горадзе і вёсцы аказаць супраціўленне соцыялістычнаму будаўніцтву.

У 1927—1928 гадах у развіцці нашай гаспадаркі абазначыліся некаторыя цяжкасці, звязаныя з новымі гіганцкімі задачамі, якія патрабавалі напружання ўсіх сіл. То былі цяжкасці росту, пагёму, развіцця прадукцыйных сіл краіны. Нашы цяжкасці карэнным чынам адрозніваліся ад цяжкасцей гаспадарчага развіцця капіталістычнай сістэмы, дзе цяжкасці адлюстроўваюць заняпад, застой, крызіс народнай гаспадаркі.

Партыя пераадалела ўсе цяжкасці пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, узначаліўшага барацьбу з правай і «левай» небяспекамі і арганізаваўшага разгром і правых і «левых» здраднікаў.

У гэтай барацьбе, якая з вялікай вастрынёй разгарнулася ўжо ў перыяд XV з'езда партыі, адным з выдатных памочнікаў таварыша Сталіна ў разгроме капітулянтаў і адшчапенцаў быў таварыш Молатаў.

Таварыш Молатаў, апіраючыся на ўказанне Сталіна аб тым, што краіна наша ідзе к соцыялізму ўпаўнена і быстра, адціскаючы на задні план і выціскаючы крок за крокам з народнай гаспадаркі капіталістычныя элементы, разгарнуў на XV з'езде партыі шырокую праграму практычных мер, якія павінны былі забяспечыць і ў сапраўднасці забяспечылі расшырэнне і ўмацаванне соцыялістычных камандных вышынь на ўсіх галінах народнай гаспадаркі як у горадзе, так і ў вёсцы.

Даклад аб рабоце ў вёсцы, зроблены таварышам Молатавым на XV з'ездзе партыі, даваў ясны аналіз эканамічных і палітычных фактаў, характарызуючых становішча вёскі ў той час. Таварыш Молатаў бліскуча паказаў, як расце ўдзельная вага серадняцкай масы ў нашай вёсцы, і падкрэсліў, што гэты факт з'яўляецца прынцыпова новым у развіцці совецкай вёскі ў параўнанні з яе дарэволюцыйным мінулым.

Выкрываючы капітулянтаў з радоў апазіцыі, таварыш Молатаў з выключнай яснасцю і выразнасцю даў у сваім дакладзе вычарпальны адказ на пытанне аб далейшых шляхах развіцця вёскі. Таварыш Молатаў паказаў, што ў вёсцы ўмацаваліся соцыялістычныя элементы, што яны растуць і будуць расці з яшчэ большым поспехам і што наша задача заключаецца ў тым, каб усямерна падтрымаць гэты рост.

Іменна з гэтага пункту гледжання таварыш Молатаў падвёр знішчаючай крытыцы праваграцкіцкія ўстаноўкі, бачыўшыя «сутнасць цяперашняга перыяда нашай палітыкі» ў развіцці прадукцыйных сіл вёскі пры дапамозе «капіталістычных метадаў».

Не «капіталістычныя метады», а поўнае пераадаленне і ліквідацыя капіталістычных элементаў ў вёсцы і ў горадзе—вось адзіны шлях быстрага развіцця прадукцыйных сіл сялянскай гаспадаркі.

Пытанні развіцця калектывізацыі ў вёсцы тав. Молатаў арганічна звязаў у сваім дакладзе з роллю кааператыў ў галіне заготовак і снабжэння, падкрэсліваючы паспяхова адбываўшыйся тады працэс арганізацыі новых грамадскіх форм сельскай гаспадаркі на аснове развіцця сельскагаспадарчай індустрыі.

Таварыш Молатаў падкрэсліў пачаўшыйся ў той час масавы рост буйнай калектыўнай гаспадаркі, паказаў велізарныя перспектывы яе развіцця, і «не калі-небудзь, праз дзесяць год і больш, а сёння, цягор-жа, на нашых вачах, у нашых умовах».

Важнейшае пытанне палітыкі і тактыкі большэвіцкай партыі ў вёсцы заключалася ў той час у тым, як наступаць, якімі метадамі і ў якіх формах рашаць задачу наступлення на капіталістычныя элементы вёскі. Таварыш Молатаў, падрабязна аналізуючы гэтае пытанне, перасцерагаў супроць усякіх фантастычных, хоць-бы і выдатных планаў і патрабаваў канкрэтных і практычных адказаў на пастаўленае пытанне. Ён даказваў, што «ні аб якіх лёгкіх перасковах ад інтэрвідуальнай да буйнай гаспадаркі не можа быць і гутаркі. Справа можа ісці толькі шляхам паступовага развіцця буйных калектыўных гаспадарак. Толькі такі шлях — правільны шлях. Ніякіх фантазій, ніякага прымусу ў адносінах селяніна пры пераходзе да буйнай гаспадаркі мы не можам дапусціць. Але гэты пераход ужо рвецца з усіх пор соцыяльна-эканамічнага развіцця вёскі». (Стэнаграфічная справаздача XV з'езда ВКП(б), стар. 1081).

У гэтай справе велізарную ролю адыгрывае культура. Таварыш Молатаў асабліва падкрэслівае гэты бок справы, указваючы, што бюракратызм і некультурнасць совецкіх, кааператыўных, а таксама і партыйных органаў былі ў той час важнейшай перашкодай на шляху соцыялістычнага развіцця вёскі.

Выкрываючы антымарксісткую трактоўку ворагамі соцыялізма пытання аб ролі культуры ў рэволюцыі, таварыш Молатаў настаянна падкрэслівае, што было-б недарачнасцю, меншавізмам буржуазнай ідэалогіяй ставіць самую магчымасць пераходу да буйнай калектыўнай гаспадаркі ў залежнасць ад пераадалення некультурнасці.

«Наша культурнасць, — гаварыў таварыш Молатаў, — будзе падніматься разам з правядзеннем эканамічнай перабудовы вёскі на аснове яе масавага кааперыравання, разам з паляпшэннем работы органаў кіравання, разам з уцягненнем мас у гэтую справу. Культура і ўменне кіраваць, калі ўзяць іх у адносінах да шырокіх мас, неразрыўна, пяснейшым чынам звязаны адзін з адным». (Там-жа, стар. 1082).

Не выпадкова таму ў таварыша Молатава пытанні калгаснага і культурнага будаўніцтва, як і пытанні дзяржаўнага кіравання і індустрыялізацыі, пяснейшым чынам звязваюцца адзін з адным, складаючы стройную і вытрыманую ва ўсіх частках сістэму. І ў пазнейшыя годы, годы бліскучых перамог калгаснага будаўніцтва, у годы гаржаства вялікіх соцыялістычных прынцыпаў у нашай краіне, таварыш Молатаў разглядае гэты пытанні ва ўзаемнай арганічнай сувязі.

Хай пацягаецца ў культурных і гаспадарчых дасягненнях з СССР любая, самая моцная і «культурная» капіталістычная краіна!

Рост совецкай эканомікі і на яго аснове рост культуры, рост матэрыяльнага дабрабыту народных мас у СССР з'явіліся прамым рэзультатам поспехаў першай і другой пяцігодак, для ажыццяўлення якіх многа і бліскуча папрацаваў В. М. Молатаў.

Тав. В. М. Молатаў у сваім рабочым кабінеце (1936 г.). Фото Ф. Кіслова. (Фота-клішэ ТАСС).

***

Будучы буйнейшым тэарэтыкам нашай партыі, выдатна ўладаючы марксісцкім філасофскім метадам, уладаючы глыбокімі ведамі эканомікі, разуменнем усяго складу усяго мінулага, усіх асаблівасцей культуры народаў СССР і ў першую чаргу вялікага рускага народа, — таварыш Молатаў ва ўсёй сваёй тэарэтычнай і практычнай дзяржаўнай рабоце дае ўзор сапраўднага марксісцкага, ленінска-сталінскага ўмення ставіць і вырашаць вялікія і складаныя задачы соцыялістычнага будаўніцтва.

Як верны вучань Леніна, як бліжэйшы саратнік таварыша Сталіна, В. М. Молатаў кожнае дзяржаўнае мерапрыемства нязменна разглядае з пункту гледжання прынцыпаў марксізма-ленінізма, пранікаючы ў самую глыбіню сутнасці пытання, ускрываючы яго слабыя бакі, беспамылкова ацэньваючы яго якасць і значэнне, яго практычную і прынцыповую каштоўнасць.

Па тым, як працуе В. М. Молатаў, вучацца сотні і тысячы дзяржаўных дзеячоў Совецкай краіны, якія выхоўваюцца ў духу вялікіх прынцыпаў марксізма-ленінізма.

Глыбокае спалучэнне тэарэтычнай прынцыповасці з практычнай дзяржаўнай мудрасцю склалае адну з найбольш яркіх асаблівасцей палітычнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу. Такім палітычным дзяржаўным дзеячом і з'яўляецца В. М. Молатаў.

Усёй сваёй шматграннай дзейнасцю В. М. Молатаў аказвае велізарны ўплыў на ўмацаванне і паляпшэнне совецкага дзяржаўнага апарата.

Роля совецкай дзяржавы велізарна. Партыя патрабуе ўсямернага ўмацавання і ўзмацнення яе магутнасці. Партыя патрабуе нясцішнага выкрыцця варожых спроб аслабіць магутнасць, паменшыць значэнне совецкай дзяржавы.

У радзе сваіх выступленняў, прысвечаных задачам соцыялістычнага будаўніцтва, пытанням народнагаспадарчага планавання, арганізацыі і работы дзяржаўнага апарата, таварыш Молатаў, строга следуючы вучэнню Леніна і Сталіна аб дзяржаве, нязменна падкрэслівае ролю і значэнне совецкай дзяржавы, як рашаючай сілы ў пабудове соцыялістычнага грамадства.

Гаворачы аб задачах другой пяцігодкі, таварыш Молатаў выкрыў схематызм і схаластыку разважанняў апаргуністаў, сказіўшых марксісцкую тэорыю развіцця грамадства, паказаў грубую памылковасць і шкоду балбатні аб непатрэбнасці або адміранні соцыялістычнай дзяржавы. Таварыш Молатаў вучыць ленінска-сталінскім адносінам да фактаў класавай барацьбы у святле якой яшчэ ярчэй абрысоўваецца гіганцкая роля совецкай дзяржавы.

***

З пытаннем аб значэнні пролетарскай дзяржавы, аб неабходнасці ўзмацнення яе магутнасці таварыш Молатаў звязвае і пытанне аб умацаванні совецкага дзяржаўнага апарата. Гэтаму пытанню таварыш Молатаў удзяляе велізарную ўвагу ў сваіх тэарэтычных працах, дакладах і выступленнях, а таксама ва ўсёй сваёй практычнай рабоце як главы совецкага ўрада.

Барацьба супроць бюракратызма, барацьба за чоткую работу апарата, за дакладнае і своечасовае выкананне пастаноў урада, за сістэматычную праверку выканання, за жывую практычную работу — вось што стаіць нязменна ў полі зроку В. М. Молатава, як кіраўніка совецкага ўрада.

Вядома, што ворагі народа ўсякімі сродкамі стараліся насаджаць бюракратызм і бюракратычныя скажэнні ў совецкім апараце для контрэволюцыйнага шкодніцтва. Барацьба з бюракратызмам, барацьба са спробамі ворагаў скарыстаць фармальна чыноўніцкія метады работы ў злачынных контрэволюцыйных мэтах, можа быць паспяховай толькі на аснове цвёрда па-большэвіцку, па-совецку, бязлітасна выкарчоўваючы руціну, косналсць, бюракратызм, фармалізм, чыноўніцкую бяздушнасць. «Мінімум, чаго мы павінны патрабаваць ад нашых работнікаў, асабліва ад комуністаў, — гэта ўменне гаварыць з рабочымі і работніцамі, з сялянамі і сялянкамі, з калгаснікамі і адналасобнікамі, і, асабліва, уменне слухаць тое, што яны гавораць, што гавораць рабочыя, што гавораць работніцы, што гавораць сяляне, што гавораць сялянкі, што гавораць служачыя і пізавыя работнікі... Калі ўся маса нашых работнікаў зробіць у гэтых адносінах адзін, але прыкметны крок уперад, то мы будзем мець істотны поспех у справе барацьбы з бюракратызмам. А ад гэтага будзе вялікая карысць для нашага будаўніцтва». (В. Молатаў. «У барацьбе за соцыялізм», стар. 422).

Уменне гаварыць з народам, уменне слухаць тое, што гаворыць народ, і скарыстаць гэта для совецкай улады — асноўнае патрабаванне, прад'яўляемае главой совецкага ўрада да работнікаў совецкага апарата. Гэта патрабаванне — само па сабе выдатна, як паказальнік новай, соцыялістычнай культуры, рост якой неразрыўна, арганічна звязан з якасцю работы совецкага дзяржаўнага апарата.

Поўны глыбокага сэнсу словы таварыша Молатава аб тым, што ў нашай пролетарскай дзяржаве, дзе кіруючай сілай з'яўляецца рабочы клас, гіганцкае значэнне мае якасць работы дзяржаўнага апарата, сапраўды соцыялістычныя метады яго дзейнасці. «Толькі апіраючыся на ўвесь апарат пролетарскай дыктатуры і ўсё больш разгортваючы работу па соцыялістычнаму перавыхаванню мас, наша партыя з чэсцю выканае задачу ператварэння ўсіх калгасаў у большэвіцкія калгасы, ператварэння ўсёй масы працоўных сялян, як і рабочых, у свядомых і актыўных будаўнікоў новага, бясклассавага грамадства.

У руках нашай партыі пролетарская дыктатура з'яўляецца разам з тым магутным апаратам арганізацыі і перавыхавання саміх рабочых». (В. Молатаў. «У барацьбе за соцыялізм», стар. 545, выд. 1935 г.).

Велізарны рост соцыялістычнай свядомасці, соцыялістычнай культуры рабочых і сялян выявіўся ў развіцці стаханоўскага руху, высунуўшага з гушчы народа выдатных герояў сталінскай эпохі. Гэтыя людзі, гаварыў таварыш Молатаў на Першай усесаюзнай нарадзе стаханоўцаў «плоць ад плоці рабочай масы», гэта «тыя, якіх большасць у рабочым класе, але гэта людзі з асаблівымі якасцямі».

«Галоўная іх якасць у тым, што гэта байцы высокай свядомасці на нашым прапоўным фронце, што гэта людзі, якія любяць працу, адданыя сваёй соцыялістычнай радзіме, сапраўдныя сыны рабочага класа, звергнуўшага буржуазію. Гэтыя людзі, смела зламаўшыя рутінныя нормы сваёй работы і вышаўшыя пераможцамі ў новай, больш высокай арганізацыі працы, выраслі з якасцямі сапраўдных байцоў за новае жыццё, за поўную перамогу працы, вызваленай ад капіталістычнага рабства». (В. Молатаў. Артыкулы і прамовы, стар. 103).

У гэтых выдатных словах дана вычарпальная характарыстыка асаблівасцей не толькі стаханоўцаў, але і ўсяго стаханоўскага руху, стаўшага магчымым толькі на аснове ўжо дасягнутай рабочым класам высокай агульнай і тэхнічнай культуры.

Следуючы ўказанням партыі і таварыша Сталіна аб значэнні кадраў — залатым фондзе партыі і дзяржавы, — таварыш Молатаў вучыць таму, як трэба ператварыць у жыццё, правяраючы на практыцы ўказанні нашага правадыра. Таварыш Молатаў заўсёды звяртае ўвагу наркомаў і іншых кіраўнікоў совецкіх устаноў і прадпрыемстваў, што адной з самых галоўных іх задач з'яўляецца падбор кадраў, устанаўленне сапраўднай праверкі работы, павышэнне якасці гаспадарчага і тэхнічнага кіраўніцтва.

***

У дакладзе на XVIII з'ездзе партыі аб грэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі тав. Молатаў даў вычарпальную характарыстыку поспехаў першых двух сталінскіх пяцігодак і нарысаваў грандыёзныя перспектывы трэцяй пяцігодкі.

У гэтым дакладзе таварыш Молатаў асобна спыніўся на пытанні аб росце матэрыяльна-культурнага ўзроўню працоўных, паказаўшы яго сувязь з агульнымі поспехамі нашай народнай гаспадаркі. Разам з тым таварыш Молатаў паказаў ролю ў гэтых поспехах перадавых людзей краіны, за якімі ідзе пераважная маса рабочых і сялян, мужных і актыўных будаўнікоў соцыялізма.

Але гэтыя выдатныя поспехі не засланяюць у вачах таварыша Молатава таго факту, што ў нашым асяроддзі ёсць і адсталыя элементы, і нават «уроды», якія знаходзяцца ў палоне дробнабуржуазных прывычак, старых, капіталістычных традыцый, прыватнаўласніцкай псіхалогіі.

З ўсёй сілай і страсцю таварыш Молатаў абрушваецца на гэтых людзей, заклікаючы да бязлітаснай барацьбы з забабонамі і перажыткамі мінулага ў сазнанні людзей.

«Яшчэ не мала такіх, — гаварыў таварыш Молатаў, — якія гатовы ўрваць для сябе ў дзяржавы набольш, а там хоць трава не расці».

Супроць такога роду «традыцый» капіталізма неабходна весці рашучую барацьбу.

«...Без узмоцненай работы па выхаванню працоўных у духу ўмацавання соцыялістычнай уласнасці і дзяржавы, нельга адсталых людзей ператварыць у свядомых і актыўных будаўнікоў комунізма».

Дысцыпліна працы, дысцыпліна дзяржаўная, якая выхоўвае ў духу чэсных адносін да дзяржавы, соцыялістычных адносіны да свайго абавязку, звязаны з правільнай арганізацыяй працы, з культурай работы.

В. М. Молатаў не раз падкрэсліваў, якое велізарнае значэнне мае праверка выканання наогул, і ў галіне планавання ў прыватнасці.

«Планы нам патрэбны. — гаварыў таварыш Молатаў на XVIII з'ездзе партыі.— для таго, каб правяраць, як вядзецца наша гаспадарчая работа. Калі-ж план не звязан з праверкай выканання, то ён ператвараецца ў паперку, у пустышку».

План — гэта жывыя людзі, вучыць таварыш Сталін.

План — гэта праграма творчай барацьбы людзей, адухаўлёных вялікай ідэяй комунізма, гаворыць таварыш Молатаў. «Вось чаму наш план, наш большэвіцкі план, наш Сталінскі план — гэта вялікая сіла. Працаваць па плану — значыць ведаць, што трэба рабіць і для якой мэты. Планы ператварыліся ў нашай краіне ў незамянімую арганізуючую сілу. Таму выконваць прыняты план стала справай чэсці працоўных СССР».

З выключнай сілай прагучаў на XVIII з'ездзе партыі выклік, які кінуў таварыш Молатаў капіталістычнай сістэме, выклік уступіць у эканамічнае спаборніцтва з СССР.

Сакрушальнай крытыцы падвёр таварыш Молатаў капіталістычны свет, які страціў веру ва ўласныя сілы, які пагроз у барацьбе за новы перадзел калоній, улез у новую чалавечую бойню. Краіны капіталізма паглынуты клопатамі аб тым, як лепш і вярней аграбіць свайго суседа. Капіталістычнаму свету процістаіць другі свет — свет соцыялізма, які радасна творыць новае жыццё. Расце і мацнее маладая, магутная, поўная здароўя і несакрушымага адзінства совецкая дзяржава.

Ці можна сумнявацца, хто выйдзе пераможцам з эканамічнага спаборніцтва двух светаў?! Сумненняў няма і быць не можа — пераможцам выйдзе СССР!

***

Нязменны заслугі В. М. Молатава перад совецкай навукай, культурай, інтэлігенцыяй.

Уся краіна ведае, як многа зрабіў і робіць таварыш Молатаў для развіцця і ўмацавання совецкай навукі, мастацтва і іншых галін нашай культуры. Выступленне таварыша Молатава на Першай нарадзе работнікаў вышэйшай школы па пытаннях, звязаных з работай Акадэміі навук СССР, яго прамовы на нарадзе перадавых калгаснікаў і калгасніц нацыянальных рэспублік з кіраўнікамі партыі і ўрада змяшчаюць у сабе каштоўнейшыя кіруючыя дырэктывы па культурнаму будаўніцтву ў СССР.

Таварыш Молатаў усямерна падтрымлівае, дапамагае, нязменна натхняе на новыя дасягненні і подвігі совецкіх людзей, якія змагаюцца з перажыткамі мінулага, дапамагае правядзенню ў жыццё ўсіх мерапрыемстваў, накіраваных на выхаванне мільёнаў новых выдатных людзей, выхаванцаў слаўнай сталінскай эпохі.

І калі таварыш Молатаў, прывёўшы словы прывітання таварыша Сталіна туркменскім коннікам — «яснасць мэты, настойлівасць у справе дасягнення мэты і цвёрдасць характару, якая ломіць усе і ўсякія перашкоды», — гаворыць, што гэтыя словы выражаюць глыбокі сэнс работы партыі над большэвіцкім выхаваннем працоўных, — ён паказвае сапраўдны змест і выключныя асаблівасці совецкай культурна-выхаваўчай работы. Гэтай справе бліскуча служыць на сваім адказнейшым дзяржаўным пасту таварыш Молатаў.

***

Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў—першы памочнік Сталіна ва ўсім дзяржаўным будаўніцтве СССР, ва ўсіх мерапрыемствах як унутранай, так і знешняй палітыкі.

З іменем В. М. Молатава звязаны ўсе выдатныя падзеі жыцця СССР: і распрацоўка і ажыццяўленне сталінскіх пяцігодак; і распрацоўка праекта Сталінскай Канстытуцыі; і росквіт і бліскучыя поспехі шматлікіх нацыянальнасцей СССР; выкрыццё і разгром ворагаў соцыялізма, прэзраных праваграцкіцкіх змоўшчыкаў; і ўмацаванне абароны СССР; і заключэнне мірных дагавораў і дагавораў аб дружбе з радам замежных дзяржаў; і выхаванне нашых герояў, вядомых і выдатных людзей, якія праславілі нашу радзіму на ўвесь свет.

«Паднімаюцца ўверх мільёны людзей, якія авалодваюць тэхнікай сваёй справы, усёй сваёй вытворчасцю, сапраўднай новай культурай, — гаварыў таварыш Молатаў на VIII з'ездзе Советаў. — Ні падрыўной работай тайных лазутчыкаў і двурушнікаў, ні спарадамі з цяжкіх гармат гэтых многамільённых радоў не разаб'еш і не расстроіш.

З небывалай быстрынёй паднімаюцца кверху новыя героі працы, узброеныя высокай тэхнікай ударнікі соцыялістычнай будоўлі, нашы слаўныя стаханоўцы і стаханоўкі. Усё новыя імёны рабочых і работніц, калгаснікаў і калгасніц, людзей культуры, тэхнікі, навукі і мастацтва становяцца вядомымі ўсёй нашай краіне, і кожнае такое імя служыць сігналам да паяўлення новых і новых.

У героях паветра, мора і Арктыкі, у героях барацьбы са стыхіямі, яны якіх растуць на нашых вачах, мы бачым правобраз герояў барацьбы супроць любога ворага СССР.

Мы павінны быць па-сапраўднаму ўзброены ўсім, чым належыць, каб ворагі ведаў што з намі жарты дрэнны». (В. Молатаў Артыкулы і прамовы, стар. 268—269).

Сапраўднасць поўнасцю апраўдала гэтыя словы таварыша Молатава. Совецкі народ атрымаў і атрымлівае вялікія сусветнагістарычныя перамогі пад вялікім сцягам Леніна—Сталіна.

У яркіх, хвалюючых словах абрысаваў таварыш Молатаў нерасрыўную сувязь ВКП(б) з совецкім народам:

«У нас стала прывычным, што ворагаў комуністычнай партыі і совецкай улады лічаць ворагамі народа...

Гэта азначае, што ў нашай краіне стварылася нябачанае раней унутранае маральнае і палітычнае адзінства народа, маральнае і палітычнае адзінства соцыялістычнага грамадства.

Такога адзінства народа не ведала і не ведае ні адна капіталістычная краіна...

Маральна-палітычнае адзінства народа ў нашай краіне мае і сваё жывое ўвасабленне. У нас ёсць імя, якое стала сімвалам перамог соцыялізма. Гэта імя разам з тым сімвал маральнага і палітычнага адзінства совецкага народа. Вы ведаеце, што гэта імя—Сталін!».

Растуць новыя і новыя мільёны герояў працы і барацьбы, выхаваныя ленінскім Сталіна, выхаваныя і праслаўленыя яго бліжэйшымі саратнікамі, сярод якіх пачотнейшае месца належыць выдатнаму чалавеку і буйнейшаму дзяржаўнаму дзеячу СССР, главе совецкага ўрада — Вячэславу Міхайлавічу Молатаву.

У СЯЛЕ МАНЗУРКА

СЯЛО МАНЗУРКА (ІРКУЦКАЯ ОБЛАСЦЬ), 7 сакавіка. (ТАСС). 197 кілометр Якуцкага тракта. Сяло Манзурка. Сюды з партыяй палітычных ссыльных прышоў у 1915 годзе «адміністрацыйна высланы» Вячэслаў Скрабін. У купецка-кулацкім сяле Манзурка ссыльных разбівалі на групы. Частка з іх аставалася тут, а многія ішлі далей, у глухія сібірскія сёлы Верхаленск, Касая стэп, Бірулька і іншыя.

Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў (Скрабін), высланы на тры годы, пасяліўся ў доме Рогалева, што стаіць неталёка ад ракі Манзуркі. Праз дом ад яго годам раней жыў М. В. Фрунзе. У таварыша Молатава часта збіраліся ссыльныя большэвікі.

У 1916 годзе таварыш Молатаў уцякае з ссылкі ў Пецербург. У доме-музеі імені М. В. Фрунзе захоўваюцца фотакопіі дакументаў, якія адносіліся да гэтага пабегу. Начальнік іркуцкага жандарскага ўпраўлення сакрэтна даносіў у томскае губернскае жандарскае ўпраўленне:

«У дадатак да запіскі маёй ад 23 ліпеня г. г. за № 12.439 маю чэсць паведаміць вашае высокаблагародзе, што па паведамленню пристава першага стана Верхаленскага павета 7 гэтага жніўня за № 169 адміністрацыйна высланы Вячэслаў Міхайлавіч Скрабін у першых лічбах чэрвеня г. г. скрыўся з-пад нагляду паліцыі ў сяле Качуге, таму абшукаць, апытаць названага Скрабіна не прадстаўляецца магчымым».

Працоўныя Манзуркі добра памятаюць аб прабыванні ў іх сяле таварыша Молатава.

— Мне было тады 13 год, — гаворыць Валенціна Лупанчыеўна Астапава, дачка Рогалевых, у якіх жыў В. М. Молатаў. — Я добра памятаю Вячэслава Міхайлавіча. Абыходзіўся ён са мной ласкава. Часта, бывала, пагладзіць па галаве і скажа:

— Малайзец, умееш гаспадарнічаць.

Пасля, паклаўшы руку мне на плячо, упэўненым голасам гаварыў:

— Нічога, хутка будзеце жыць добра, па-іншаму.

Словы таварыша Молатава збыліся. Няма больш сяла Манзуркі з дзесяткамі кабакоў, царквай, цэрквай і невуцтвам. Новая Манзурка — багатае калгаснае сяло. Тут дзве сельгасарцелі імені В. М. Молатава і імені Ем. Яраслаўскага, машынна-трактарная станцыя, пяцігадовая сярэдняя школа, клуб, хата-чытальня, бібліятэка, бальніца, яслі, дзіцячы сад. У сяле працуе больш ста настаўнікаў, урачоў, атрапомаў, зоатэхнікаў і інш. У мінулым годзе з ліку калгаснікаў падрыхтавана 100 трактарыстаў, многа камбайнераў, паляводаў, брыгадзіраў.

Прапоўныя Манзуркі жывуць культурна, весела, заможна.

СУСТРЭЧЫ З ТАВАРЫШАМ МОЛАТАВЫМ

* * *

У ГАСЦЯХ У ВЯЧЭСЛАВА МІХАЙЛАВІЧА

У пачатку кастрычніка 1935 года нас з Вічугі выклікалі ў Маскву.

Гэта было ў самым пачатку стаханаўскага руху, а ў нашым гэкстыльным краі Іванаўскай вобласці, ён разгараўся сярод ткачых. Мы ў сябе, у Вічузе, толькі што паставілі новы сусветны рэкорд — перайшлі працаваць на 144 станкі.

Прыехалі ў Маскву. Спачатку нас, стаханаўцаў лёгкай прамысловасці, сабралі ў Паркамаце, была нарада. Потым нам сказалі:

— Вас кліча да сябе ў госці таварыш Молатаў. У Крэмль, у Соўнарком.

Нам стала і радасна і боязна. Ці маглі мы калі-небудзь марыць, што нам — простым ткачыхам — давядзецца сустрэцца з главой совецкага ўрада, з бліжэйшым саратнікам вялікага Сталіна. Не толькі сустрэцца, але і расказваць яму аб сваіх справах, поспехах. Мы хваляваліся: а можа зададзць такое пытанне, што мы не зможам адказаць? Мы разважалі: ці суровы, ці строгі ён чалавек?

З гэтымі думкамі мы ўвайшлі ў Крэмль. Нас сустрэлі як жаданых гасцей: былі накрыты сталы, было святочна, весела.

І раптам увайшоў таварыш Молатаў. Такі просты чалавек. Баязлівасці нашай як не бывала! Нас адразу пазнаёмілі. Мы і не заўважылі, як ужо ўключыліся ў агульную гутарку.

Але вось нас папрасілі расказаць аб тым, як мы дабіліся поспехаў. Мы зноў захваляваліся і гаворым:

— Мы-ж, таварыш Молатаў, не ўмеем выступаць.

А Вячэслаў Міхайлавіч сардэчна:

— Каго вы сароміцеся? Тут усе рабочыя, усе свае людзі і сароміцца няма каго. Проста раскажыце, як вы працуеце.

Пасля гэтых слоў нам стала добра. Мы адчулі сябе свабодна і пачалі расказваць.

Таварыш Молатаў падрабязна распытваў аб нашых рэкордах і цікавіўся гісторыяй гэтых рэкордаў.

— Ну, вось скажыце: вы самі дадумаліся да гэтага ці хто-небудзь вам прапанаваў узяць столькі станкоў?

— Не, — гаворым, — гэта мы самі вызваліся.

Тады таварыш Молатаў пачаў распытваць, хто нам у гэтай справе дапамагаў. Потым ён запытаў:

— А як рабочыя, ці ўсе задаволены стаханаўскім рухам, ніхто не крычыць на вас? І ці не перашкаджае хто вам?

Мы нават здзівіліся. Быццам таварыш Молатаў у гэтыя дні быў у Вічузе і ведае, што рабілася тады на нашай фабрыцы. У дакладнасці адгадаў. Было ўсё: і перашкаджалі нам спачатку і рабочыя некаторыя крычалі на нас. Моў, мы многа на сябе бяром і са справай не справімся. Мы расказалі аб усім таварышу Молатаву.

К канцу гутаркі мы настолькі звыкліся з таварышам Молатавым, гутарка наша цякла так лёгка, быццам мы знаёмы з ім цэлую вечнасць. Ён пытаў, як мы ўстроіліся ў Маскве, ці спадабалася сталіца.

Гутарка падыходзіла к канцу. Таварыш Молатаў развітаўся з намі.

— Жадаю вам усяго добрага, — сказаў ён. — Мабыць, у бліжэйшы час сустрэнемся.

Прайшло нямнога часу. 14 лістапада ў Вялікім Крэмлёўскім палацы адкрылася выдатная нарада стаханаўцаў прамысловасці і транспарта. Нас таксама выклікалі на гэту нараду. Мы сядзелі блізка ад прэзідыума, ад таварышаў Сталіна і Молатава. Таварыш Молатаў паказаў на нас таварышу Сталіну як па старых сваіх знаёмых:

— Вось ткачыхі Вінаградавы...

Пасля нарады стаханаўцаў, калі нас узнагароджвалі ордэнамі, таварыш Молатаў падышоў да нас. Ён падрабязна распытваў, як мы працуем, як адчуваем сябе. Мы расказалі Вячэславу Міхайлавічу аб нашых справах, сказалі, што цяпер працуем на 216 станках.

Мы часта атрымліваем пісьмы ад выбаршчыкаў. Прыходзіцца звяртацца да таварыша Молатава па дэпутацкіх справах для вырашэння розных пытанняў. І заўсёды мы знаходзім у таварыша Молатава вялікую ўвагу, патрэбны адказ і неабходнае падтрыманне.

Еўдакія ВІНАГРАДАВА,
дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.
Марыя ВІНАГРАДАВА,
дэпутат Вярхоўнага Савета РСФСР.

СТРОГІ ЦАНІЦЕЛЬ МАСТАЦТВА

У дзіночыя годы мы часта марылі аб Маскве. Уяўленне аб ёй было цьмянае, але цудоўнае. Масква песна звязвалася з імёнамі Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна і Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

Мы ведалі колькі ўвагі і клопатаў праяўляюць кіраўнікі партыі і ўрада совецкаму мастацтву і ў асаблівасці яго малодым прадстаўнікам. Вучыцца, удасканальваць свае веды, адчачаць сваё майстэрства настолькі, каб быць дастойным гэтай увагі, было нашай заветнай мэтай.

Успамінаецца першы ўсесаюзны конкурс музыкантаў-выканаўцаў, першая паездка ў сталіцу. Першая, глыбока запаўшая ў памяць сустрэча з кіраўнікамі партыі і ўрада.

Вялікая зала кансерваторыі перапоўнена публікай. Прадстаіць заключны канцэрт конкурса. Падыходзячы да раяля, ясна бачыш: у ложы направа ад эстрады, сядзяць таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Каганові́ч.

Пасля канцэрта нас запрасілі ў ложу. Цёпла, па-прыяцельску, сустрэлі нас, юнноў, кіраўнікі партыі і ўрада.

Хутка ў газетах мы прачыталі пастанову Совета Народных Камісараў Саюза ССР, падпісаную таварышам В. М. Молатавым, аб прэміраванні юных музыкантаў: Б. Гальштэйна, А. Каплана, Б. Прытыкінай, Лізы Гілельс, М. Фіхтэнгольца і Эміля Гілельса. Услед за гэтым уся гэтая група была запрошана ў Крамль, да таварыша Молатава.

Вячэслаў Міхайлавіч прымаў нас у сваім кабінеце. З намі ён быў выключна ласкавы і гасцінны. Ён прачытаў нам уголас пастанову аб прэміраванні юных музыкантаў, затым гаварыў аб тым, як важна тая справа, якою мы займаемся.

Пасля гэтага нам не раз даводзілася чуць выказванні таварыша Молатава з гоману выканання якога-небудзь артыста або мастацкага калектыва. Гэтыя апэнкі зноў і зноў пацвярджаюць першае ўражанне ад яго слоў, звернутых да нас у Крэмлі. Таварыш Молатаў ведае і любіць музыкальнае мастацтва.

Зусім нядаўна — гэта было ў Народным камісарыяце замежных спраў — Вячэслаў Міхайлавіч запытаў пры сустрэчы:

— Над чым вы працуеце зараз, Эміль?

Уважліва выслухаўшы адказ, Вячэслаў Міхайлавіч запікавіўся:

— Чаму вы выбралі зараз для свайго рэпертуара іменна кампазітараў-рамантыкаў?

Відаць было, што пытанні задаваліся не з простай ветлівасці, а з жадання ўлавіць настрой музыканта, напрамак, у якім развіваецца яго майстэрства...

Мы адчуваем асаблівую адказнасць, выступаючы ў прысутнасці таварыша Молатава.

Для нас лепшая ўзнагарода, калі мы чытаем на твары Вячэслава Міхайлавіча адабрэнне нашаму выкананню.

ЛІЗА і ЗМІЛЬ ГІЛЕЛЬС.

* * *

Таварыш Молатаў на Кузнецкбудзе

Мая першая сустрэча з тав. В. М. Молатавым адбылася восенню 1934 года на пляцоўцы Кузнецкага завода, дзе ў гэты час прадаўжалася будаўніцтва магутнага первянца сібірскай металургіі і ўжо ішла поўным ходам эксплаатацыя раду закончаных агрэгатаў у асноўных творчых цэхах.

Тав. Молатаў любаваўся магутнай карцінай гаржаства совецкай тэхнікі, работай новых, поўнасцю механізаваных домен, мартэнаў і пракатных станаў. Вельмі добра ведаючы ўмовы цяжкай працы рабочых на металургічных заводах Данбаса, атрыманых намі ў спадчыну ад царскай Расіі, ён быў глыбока задаволен відовішчам гаго, як сістэма механізмаў замяняе работу многіх сотень чалавечых рук, аблягчаючы працу людзей і ў велізарнай ступені павышаючы яе прадукцыйнасць.

Азнаёміўшыся з планам завяршэння будаўніцтва камбіната і адзначыўшы раз недахопаў будаўніцтва, таварыш Молатаў паставіў пытанне аб тым, што-ж мы робім для падняцця ўсёй культуры вытворчасці на такую высокую ступень, якую патрабуе тэхнічны ўзровень нашага механізаванага завода-гіганта.

Без глыбокай і пастаяннай работы над асваеннем навейшых дасягненняў металургічнай тэхнікі, гаварыў тав Молатаў, і без самастойнай распрацоўкі пытанняў удасканалення і найлепшай эксплаатацыі тэхнічнага ўзбраення завода мы не перагонім перадавыя капіталістычныя краіны нават пры першакласным аснашчэнні нашых прадпрыемстваў. Каля вашых выдатных агрэгатаў, прадаўжаў ён, павінна нясынна працаваць мысль совецкіх тэхнікаў, вынаходзячы ўсё новыя і новыя прыёмы работы, новыя шляхі лепшага скарыстання прадастаўленага вам абсталявання. Толькі такім шляхам, а не самацёкам мы з поспехам вырашым задачу тэхнічнага і эканамічнага спаборніцтва двух сістэм — сацыялізма і капіталізма.

Тав. Молатаў папрасіў мяне паказаць яму нашу заводскую лабараторыю і тэхнічную бібліятэку. Я з радасцю павёў яго туды, бо, працуючы ў новых, яшчэ не вывучаных умовах, мы сільна апіраліся на нашу лабараторыю і бібліятэку і ўклалі ўжо многа сіл у стварэнне гэтых важных ачагоў вытворча-тэхнічнай культуры. Нам было што паказаць, не гледзячы на незакончанасць абсталявання лабараторыі.

У тэхнічнай бібліятэцы тав. Молатаву, відаць, спадабалася сістэма абслугоўвання чытачоў і добра пастаўленая інфармацыйная картатэка. Аднак Вячэслаў Міхайлавіч не задаволіўся адным добрым знешнім выглядам нашай бібліятэчнай сістэмы і рашыў зараз-жа праверыць, як гэта сістэма дзейнічае на практыцы. Ён патрабаваў на вытрымку рад матэрыялаў і толькі пасля здавальняючага рэзультата выказаў сваю станоўчую ацэнку.

У нашай лабараторыі тав. Молатаў звярнуў галоўную ўвагу на кантрольна-вымяральную апаратуру, на вымяральныя прыборы, а якраз у гэтых адносінах у нас і было не ўсё добра. Мы своечасова прызапасілі неабходныя прыборы, але не ўстанавілі многіх з іх з-за недахвату мантажных матэрыялаў. Я выказаў свой погляд, што прыборы ў такой лабараторыі, як наша, нельга ўстанаўліваць на ўсякіх сурагатах і «времянках».

— Гэта верна. — адказаў тав. Молатаў. — але вы ўсё-такі марудна робіце такую важную справу, недастаткова настойліва патрабуеце тое, што вам патрэбна. Я вам дапамагу, бо гэта патрэбна для добрай работы завода, а вы складзіце максімальна быстры графік мантажа прыбораў і прасачыце за яго выкананнем.

Вячэслаў Міхайлавіч выканаў, сваё абяцанне, мы атрымалі яго дапамогу, і наша лабараторыя была хутка аснашчана навейшымі вымяральнымі прыборамі. На заводзе адразу-ж адчуліся рэзультаты прыезду да нас главы нашага ўрада.

Тав. Молатаў выступіў на многатысячным мітынгу калектыва будаўнікоў і эксплаатацыйнікаў нашага завода. У вялікай, гарачай прамове ён ярка абрысаваў перад намі ўсё народнагаспадарчае і палітычнае значэнне поспехаў нашай будоўлі і затым даў разгорнутую карціну міжнароднага становішча Совецкага Саюза. Выступленне тав. Молатава было сустрэта з захапленнем тысячамі рабочых і інжынераў Кузнецкага завода і мабілізавала іх на новыя намаганні для сканчэння велізарнага і пяжкага будаўніцтва.

Усе мы разыходзіліся з мітынга з надоўга астаўшымся ўнутраным узлымам ад пазнання жывой, непасрэднай сувязі нашага далёкага завода з цэнтрам нашай радзімы, з совецкім уралам і Цэнтральным Камітэтам гераічнай партыі большэвікоў.

У дзень пяцідзесяцігоддзя тав. В. М. Молатава, які нясе адказнейшыя абавязкі главы совецкага ўрада і народнага камісара па замежных справах, з выключнай шчырасцю і дастоінствам ажыццяўляючага міжнародную і ўнутраную палітыку першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы ў найцяжэйшых умовах разгарнуўшайся імперыялістычнай вайны, хочацца ад усёй душы пажадаць яму многіх, многіх год работы і барацьбы на карысць нашай вялікай радзімы.

Акад. І. П. БАРДЗІН.

* * *

НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Я меў шчасце не адзін раз сустракацца з Вячэславам Міхайлавічам Молатавым, але тры сустрэчы пакінулі найбольш яркае, незабыўнае ўражанне і з'яўляюцца самымі выдатнымі падзеямі ў маім жыцці.

У 1932 годзе я ў ліку невялікай групы вучоных быў запрошан на кватэру да А. М. Горкага для ўдзелу ў абмеркаванні плана арганізацыі Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай медыцыны (УІЭМ).

На гэтай гістарычнай нарадзе прысутнічалі таварышы Сталін, Молатаў і Варашылаў.

Мы пазнаёміліся і селі за стол. Пачалася афіцыяльная частка нашай сустрэчы.

Прафесар Л. Н. Фёдараў коратка ізлажыў арганізацыйныя прынцыпы будучага Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай медыцыны.

Пачалося абмеркаванне праекта. Першае слова Алексей Максімавіч прадаставіў Іосіфу Вісарыёнавічу.

Таварыш Сталін сказаў выдатную прамову, у якой я ўпершыню пачуў яго асноўныя мысліі аб інтэлігенцыі.

Затым выступіў Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў. Ён многа ўвагі ўдзяліў ініцыятарам гэтага велізарнага новага пачынання, развіваючы ідэю аб комплексным падыходзе да вывучэння хворага і здаровага чалавечага арганізма.

Гутарачы з кожным з нас паасобку, таварышы Сталін, Молатаў і Варашылаў глыбока цікавіліся пытаннямі тэарэтычнай і практычнай медыцыны.

Усё было прадумана да дробязей. Выпесенае рашэнне сфармулявана чотка і ясна.

І другая мая сустрэча з Вячэславам Міхайлавічам адбылася ў А. М. Горкага. Я быў адзіны ўрач, якога Алексей Максімавіч запрасіў да сябе на сустрэчу пісьменнікаў з таварышамі В. М. Молатавым, К. Е. Варашылавым, Л. М. Каганові́чам, А. І. Мікаянам, В. В. Куйбышэвым.

У той час я загадваў маскоўскім філіялам УІЭМ, які мы стварылі з вялікім хапленнем і энтузіязмам.

Убачыўшы мяне, Вячэслаў Міхайлавіч адвёў мяне ў бок, пачаў падрабязна распытваць, як ідуць справы, што перашкаджае разгортванню работы. Ён перажываў мае няўдачы, прасіў адкрыць філіял і, не саромячыся, тацца за дапамогай да яго. Потым пазнаёміў мяне з Л. М. Каганові́чам, быў у той час сакратаром ЦК ВКП(б), і прасіў яго таксама дапамагаць нашай справе.

Трэцяя выдатная сустрэча з Вячэславам Міхайлавічам Молатавым адбылася ў 1936 годзе на пасяджэнні Соўнаркома СССР, дзе заслухоўваўся даклад аб рабоце УІЭМ. На гэтым пасяджэнні з Вячэславам яркасцю я ўбачыў выдатныя рысы таварыша Молатава, як выдатнага жаўнага дзеяча, бліжэйшага сарадніка вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

Абмеркаванне работы УІЭМ выявіла значных недахопаў. Некаторыя з прычын на нарадзе прабавалі скарыстаць гэта для таго, каб гаварыць аб неабходнасці УІЭМ і нават прапанаваць закрыць яго. Іх выпады сустрэлі адзінаходнымі пор з боку таварышоў Варашылава і Молатава, Орджанікідзе.

Рэзюміруючы вынікі выступленняў, Вячэслаў Міхайлавіч даў рэзкую ацэнку, ведзь усім тым, хто прабаваў такім чынам грунтавана абагульваць асобныя недахопы, немінучыя ва ўсякай новай справе ў перыядзе яе росту. Таварыш Молатаў кваліфікаваў гэтыя выступленні як партыйныя, палітычна шкодныя. Падкрэсліўшы, што, не гледзячы на адзіныя промахі і памылкі, УІЭМ сябе апраўдаў, Вячэслаў Міхайлавіч прапанаваў канкрэтную праграму дзеянняў на ўвесь час і ўказаў асноўныя шляхі для правільнага развіцця недахопаў.

Рашэнне Соўнаркома аб рабоце УІЭМ ад ліпеня 1936 года і да гэтага часу з'яўляецца важнейшым дакументам для ўсёй совецкай аховы здароўя, для медыцынскіх работнікаў нашай краіны.

Прафесар І. РАЗЕНКО.

ЧУТКАСЦЬ І СПАГАДЛІВАСЦЬ

Першая мая сустрэча з Вячэславам Міхайлавічам Молатавым адбылася ў снежні 1935 года. Разам з групай акадэмікаў мы прышлі да главы ўрада, каб расказаць яму аб неадкладных патрэбах навукова-даследчых устаноў па сельскай гаспадарцы і атрымаць ад яго неабходныя ўказанні.

Таварыш Молатаў выслухаў кожнага з нас выключна ўважліва. Слухаючы яго адказнае слова, узіраючыся ў выражэнне яго злёгку стомленага твару, я ўлавіў некалькі характэрных рысаў, якія мяне асабліва ўсхвалявалі.

Перш за ўсё я адчуў непахісную веру Вячэслава Міхайлавіча ў сілу навуковай творчасці совецкага чалавека, яго цвёрдае перакананне ў тым, што дзеячы сельскагаспадарчай навукі здолеюць дапамагчы нашай краіне вырашыць усе тыя цяжкія і складаныя задачы, якія штодзень высоўваюцца практыкай сацыялістычнай будоўлі.

Другое, што ў мяне запечатлелася, — гэта чуткія адносіны Вячэслава Міхайлавіча да вучоных. «Беражыце і клапаціцеся дапамагайце рабоце кожнага дзеяча навукі, які прыносіць карысць нашай краіне» — у гэтых простых словах выявілася не толькі чуткасць, уласцівая Вячэславу Міхайлавічу, у гэтыя словы быў укладзен велізарны дзяржаўны сэнс, пункт погляду беражлівага і клапатлівага кіраўніка ўрада, які захоўвае і песціць усё каштоўнае, што самейнічае прагрэсу і росквіту кіруемай ім краіны.

Трэцяе, што мне надзвычай спадабалася, — гэта патрабаванне Вячэслава Міхайлавіча ад людзей навукі шырокага кругазору, паглыбленай тэарэтычнай падрыхтоўкі, ведання гісторыі, дасягнення скарыстання дасягнення зарубежных навук, прымянення дакладных навуковых метадаў у рабоце.

У гэтых устаноўках выявіліся рысы стыль мышлення Вячэслава Міхайлавіча, разуменне ім глыбінь навуковага даследчай работы.

Другая мая сустрэча з тав. Молатавым адбылася ў лютым 1936 года ў дні ўручэння мне тав. М. І. Калінінам ордэна Леніна.

Нас віталі кіраўнікі партыі і ўрада. Побач з таварышам Сталіным стаяў верны саратнік таварыш Молатаў.

Каля года таму назад да Усесаюзнага інстытута гельмінталогіі была прадпісана несправядлівасць. Калектыў маіх калег аб гэтым да ведама таварыша Молатава. Прайшло не больш 2 сутак, праўда была адноўлена.

Такая ўвага, чуткасць і спагадлівасць Вячэслава Міхайлавіча зрабіла на супрацоўнікаў інстытута велізарнае ўражанне.

Вось чаму імя Вячэслава Міхайлавіча вымаўляецца ўсімі намі з найвялікшай павагай і любоўю.

К. І. СКРЯБІН,
заслужаны дзеяч навукі, акадэмік, ордэнаносец.

Клапатлівы друг дзяцей

Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў — шэф усесаюзнага піонерскага лагера «Артэк» (Крым). Пішучаму гэтыя радкі пашчасліўла быць сведкай сустрэч рэбят з «Артэка» з таварышам Молатавым.

Упершыню ў лагер «Артэк» Вячэслаў Міхайлавіч прыехаў у 1934 годзе. Прыезд яго быў нечаканы. Дзеці пасля абеда адпачывалі. Але не паспеў дзяжурны па лагеру даць сігнал на пал'ём, як рэбяты ужо былі на нагах: хтосьці іх паспеў паведаміць аб прыездзе дарагога гасця.

Па алеях і дарожках ніжняга лагера дзеці беглі насустрач да Вячэслава Міхайлавіча.

Акружаны дзецьмі, таварыш Молатаў пайшоў па лагеру. Рэбяты наперабой пачалі яму расказваць аб жыцці ў гэтым цудоўным кутку поўдня. Тады Вячэслаў Міхайлавіч папрасіў аднаго хлопчыка-узбека, каб той адзін расказваў. Хлопчык яшчэ дрэнна валодаў па-руску, але ён не збянтэжыўся і расказаў аб распарадку дня ў лагеры.

Цікавячыся ўсім, уваходзячы ва ўсе падрабязнасці жыцця лагера і тут-жа даючы ўказанні па тых ці іншых пытаннях, таварыш Молатаў прадаўжаў знаёміцца з рэбятамі. Радасць і весёлы настрой дзяцей усё ўзрасталі, таварыш Молатаў радаваўся і смяяўся разам з імі.

Многія з рэбят упершыню ў Крыму. Таварыш Молатаў звярнуў нашу ўвагу на гэтую акалічнасць і ўказаў, што нам неабходна паказаць рэбятам увесь паўднёвы берег Крыма. Ён выказаў думку аб неабходнасці завесці ў «Артэку» аўтобусы з тым, каб катаць на іх дзяцей. Апрача таго ён указаў, што «Артэку» трэба мець сваю падсобную гаспадарку — малочную ферму, кветнікі і інш.

Агледзеўшы ніжні і верхні лагеры, таварыш Молатаў накіраваўся ў парк. Там ён наглядаў за іграмі дзяцей па спартыўных пляцоўках і атракцыёнах. Затым ён з дзецьмі пайшоў у сталовую і разам з імі вячэраў.

Пасля вячэры ўсе сабраліся на кастровай пляцоўцы «Артэка». Загараўся вялікі піонерскі каспёр. Дзеці выступалі ля кастра. Яны дэманстравалі перад Вячэславам Міхайлавічам сваю творчасць. На пляцоўцы з дзіцячых фігур вырасла жывая кветка. Калі яна раскрылася, у цэнтры яе паказаліся гры маленькія дзяўчынкі. Яны грымалі ў руках вялікія букеты кветак. Вышаўшы з круга, дзяўчынкі падышлі да Вячэслава Міхайлавіча і паднеслі яму кветкі. Таварыш Молатаў распалаваў па чарзе дзяўчынак і ўсадзіў іх побач з сабою.

Рэбяты спявалі песні, разам з імі спяваў і таварыш Молатаў. Пасля фізкультурных выступленняў артэкаўцы розных нацыянальнасцей праспявалі свае песні, паказалі пляскі. Затым па просьбе дзяцей на кастры выступіў таварыш Молатаў. Ён расказваў рэбятам аб жыцці дзяцей у мінулым параўноўваў гэтае жыццё з сучасным совецкай дзетвары. Рэбяты падзелі таварышу Молатаву піонерскі гальштук і назвалі яго пачотным піонерам-артэкаўцам.

Пасля ўрачыстай піонерскай лінейкі—спуску сцяга — таварыш Молатаў пажадаў рэбятам спакойнай ночы, абяцаў выканаць іх просьбу — перадаць прывітанне таварышу Сталіну. — і паехаў. Доўга глядзелі дзеці ўслед удаляўшайся па звілістай крымскай дарозе машыне, у якой паехаў Вячэслаў Міхайлавіч.

Яшчэ раз таварыш Молатаў прыязджаў у «Артэк» у 1935 годзе. Апрача таго артэкаўцы не раз бывалі на дачы ў таварыша Молатава ў час яго адпачынку ў Крыму. І кожны раз Вячэслаў Міхайлавіч гасцінна сустракаў артэкаўцаў, праводзіў з імі цэлыя дні да самага вечара.

Аднаго разу таварыш Молатаў праз рэбят, якія пабывалі ў яго, прыслаў артэкаўцам пісьмо:

Тав. В. М. Молатаў сярод артэкаўцаў (здымак 1934 г.). Фота С. Ласкутова (Фота-кліша ТАСС).

«Піонеркам і піонерам «Артэка»

Шлю гарачае прывітанне. Жадаю добра адпачыць, набраць здароўя і сіл для работы, і перш за ўсё, для вучобы, каб стаць актыўнымі, свядомымі ўдзельнікамі нашага будаўніцтва, у якім піонеркі і піонеры ўжо займаюць слаўнае месца маладых байцоў соцыялізма.

Вас. В. Молатаў.

13 VI. 1934 года».

Успамінаецца паездка артэкаўцаў да таварыша Молатава летам 1936 года. Вячэслаў Міхайлавіч адпачываў тады ў Крыму.

Таварыш Молатаў раласна сустрэў дзяцей і пачаў з імі знаёміцца. Імёны і прозвішчы іх ён адразу запомніў і на працягу ўсяго дня кожнага называў па імені і прозвішчу.

З чамі тады прыехаў наш лагерны баяніст дзядзя Міша.

— Баяніст у лагеры — вялікая справа, — сказаў таварыш Молатаў і, падышоўшы да збянтэжанага дзядзі Мішы, прывітаўся з ім.

Таварыш Молатаў пазнаёміў сваю дачку Светлану з рэбятамі, у прыватнасці са славутай піонеркай Мамлакат Нахангавай. Сьетлана ёй узрадавалася і прачытала гасцям верш, прысвечаны Мамлакат. Потым выступалі артэкаўцы. Асабліва таварышу Молатаву праспявалі песня «Родина», якую праспявалі рэбяты.

— Салаўя байкамі не кормяць, — сказаў таварыш Молатаў і павёў дзяцей у сталовую.

За абедам адбыўся маленькі кур'ёз. Хлопчык-кавказец Лёша Кім замест апельсіна ўзяў лімон, паспрабаваў яго і ўскрыкнуў: «Кісла, кісла!». Рэбяты пачалі смяяцца, таварыш Молатаў супакоіў Лёшу. Ён выціснуў лімон на шпроты і сказаў:

— Вось цяпер паспрабуй.

Пасля абеда пайшлі адпачываць. Таварыш Молатаў сказаў рэбятам:

— Усе мы з вамі ў водпуску, і трэба захоўваць рэжым.

Дзяцей уклалі спаць. Але, як толькі Вячэслаў Міхайлавіч адышоў, рэбяты паўскоквалі з месц і пачалі дзяліцца ўражаннямі. Пазней, калі таварыш Молатаў зноў паявіўся ў садзе, рэбяты ўросыпь кінуліся па сваіх месцах. Вячэслаў Міхайлавіч убачыў гэта і, смеючыся, закрычаў: «Бачу, бачу!».

Затым дзеці разам з таварышам Молатавым доўга гулялі. Вячэслаў Міхайлавіч расказваў ім аб прыродзе асобных раслін. Калі дзеці ад'язджалі, тав. Молатаў перадаў з імі запрашэнне артэкаўцам па дарозе з Крыма заехаць у Маскву, у Крэмль.

17 верасня 1936 года на Краснай плошчы, ля маўзалея Леніна, сабралася дзвесце прыгожа апранутых рэбят. Усе яны былі ў парадных артэкаўскіх касцюмах, а на бесказырках залатымі літарамі было напісана «Артэк». Яны прайшлі ў Крэмль і накіраваліся ў залу пасяджэнняў Соўнаркома.

Зала была святочна ўпрыгожана. Артэкаўцы засыпалі яе кветкамі, якія яны прывезлі ў падарунак таварышу Молатаву. Малышы падышлі да сталоў, дзе для іх былі прыгатаваны горы фруктаў і ласункаў. Яны адразу ўзяліся за шакалад. Больш старэйшыя трымалі сябе чынна, урачыста.

І вось увайшоў таварыш Молатаў. Гулам поўных захаплення прывітанняў сустрэлі яго рэбяты. Вячэслаў Міхайлавіч з усімі прывітаўся. Многіх ён велаў па імёнах.

— А дзе Лёша Кім? — запытаў ён.

— Я тут.

— Ну як, лімон кіслы?

— Кісла, кісла, — смяяўся Кім.

Таварыш Молатаў вітаў дзяцей і сказаў што цяпер артэкаўцам, добра адпачыўшым і акрэпшым, трэба ўзяцца за вучобу. А вучыцца яны павінны добра.

— Цяпер хто з вас раскажа, як вы жылі ў Артэку? — запытаў таварыш Молатаў.

Адбылася маленькая замінка. Таварыш Молатаў вывёў дзяцей з сарамлівасці:

— Ну, хто ў вас самы храбры?

Рэбяты хорам закрычалі:

— Баразбі!

Гэта быў стары знаёмы таварыша Молатава. Баразбі Хамгокаў падышоў да грыбуны і пачаў гаварыць. Таварыш Молатаў падрабязна распытваў, як дзеці правялі час, ці каталіся на лодках, ці ездзілі вярхом на конях, ці хадзілі ў горы... Баразбі расказаў, якія экскурсіі і паходы зрабілі артэкаўцы.

— Што-ж гэта азначае, — пытае таварыш Молатаў, — выходзіць, вы і не адпачывалі, а ўсё хадзілі ў экскурсіі?

— А гэта-ж і ёсць адпачынак, таварыш Молатаў, — сказалі дружна рэбяты.

— Ну, тады правільна.

Ажыўленая гутарка ўвесь час перарывалася смехам, жартамі. Затым артэкаўцы станцавалі «Матрошку» пад гармонік. Выступіў скрыпач-артэкавец. Чыталі вершы. Потым усе заспявалі хорам. Падпяваў і таварыш Молатаў. Рэбяты спявалі яго любімыя песні.

Заспявалі песню пра «Артэк» і пра да куплета:

«У «Артека» на посу
Приютился Суук-су... »

Таварыш Молатаў засмяяўся і сказаў:

— Ваш намёк няцяжка зразумець, што-ж, прыдзецца Суук-су перайсці ў «Артэку». Як вы думаеце, правільна гэта?

Бура апладысментаў. Рэбяты з задаволеннем закрычалі: «Правільна!».

Гісторыя з Суук-су ўзнікла нясподзеўна. Яшчэ ў 1935 годзе, калі дзеці былі на дачы ў тав. Молатава, гутарка зайшла аб «вялікім «Артэку», аб генеральным плане. Тав. Молатаў азнаёміўся з гэтым планам і сказаў, што ў ім няма месца генеральнага. Між тым побач з «Артэкам» было выдатнае месца, называемае Суук-су. Рэбяты даўно кваніліся на яго, гаварылі, што нядрэнна было-б яго далучыць да «Артэка». Таварыш Молатаў зразумеў намёк рэбят, і цяпер Суук-су перайшло ў «Артэку».

Рэбяты прывезлі многа падарункаў таварышам Сталіну, Молатаву і членам іх сямёй. Калекцыя каменняў і раслін, зробленых актывістамі музея краязнаўства «Артэка», была прызначана таварышу Сталіну. Рэбяты папрасілі таварыша Молатава перадаць падарунак Іосіфу Вісарыёнавічу.

— Абавязкова перадам, — абяцаў таварыш Молатаў.

Затым Вячэслаў Міхайлавіч паціснуў рэбятам шчаслівай дарогі і пажадаў правільна размеркаваць свае сілы з тым, каб іх хапіла на ўвесь вучэбны год і на наступнага адпачынку.

У «Артэку» паявілася новая песня:

«И помнит каждый час
Любимый Молотов о нас.
Как много сделал этот человек!
Мы во дворце живем,
И мы всегда поем:
«Артек», «Артек»...».

Л. ОЛЬХОЎСКІ.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОВА

Уп. Галоўлітбела № 3—1677. Мінск. друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., Л., Ш.